Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 321 (4227)
Панядзелак, 30 лістапада
1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Выкарыстаць вытворчыя магчымасьці прамкаапэрацыі (1 стар.). Я. ІВАШЫН—Сельпартыкомы ў сыстэме першаўдовы партработы на вёсцы. (2 стар.). Л. ЧАРНЯКОЎ—Замацуем першыя посьпехі (3 стар.).
АБ РАБОЦЕ ЗБОЖЖАВЫХ САЎГАСАЎ—пастанова Саўнаркому СССР і ЦК УсеКП(б) (1 стар.).
БІБЛІЯГРАФІЯ (4 стар.).
Шклоўская МТС яшчэ ня сталааргінізатарам ільнаапрацоўкі (1 стар).
Загатоўкі сьвіней—найбольш адсталы вучастак (1 стар.).
Бязьлітасна змагацца з апартуністычнай недаацэнкай (2 стар.).
Рабселькоры—на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў! (3 стар.).
КІТАЙ.
Ваенныя спэкулянты нажываюцца (4 стар.).
АНГЛІЯ.
Франка-японскае супрацоўніцтва мае на мэце падрыхтаваць інтэрвэнцыю супроць кітайскіх саветаў (4 стар.).

Выкарыстаць вытворчыя магчымасьці прамкаапэрацыі

XVI-ы зьезд УсеКП(б), а потым пленумы ЦК у сваіх рашэньнях падкрэсьлілі, як адну з важнейшых задач — фарсаванае разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці.

Гэтыя рашэньні асаблівае значэньне набываюць для прамысловай каапэрацыі, якая мае значную ўдзельную вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы БССР і адыгрывае вялікую ролю ў стварэньні тавараў для паляпшэньня снабжэньня рабочых і калгасьнікаў.

Сампрамкаапэрацыі БССР за 9 месяцаў 1931 году выпусьцілі прадукцыі на 97.937.9 тыс. руб. супроць 66 мільёнаў рублёў за ўвесь 1930 год. Усё больш і больш асвойваецца мясцовы сырэц. Адносная вага промыслаў, якія працуюць на мясцовым сырцу, павялічылася да 51 проц. супроць 41 проц. у 1929-30 годзе. Доля прадукцыі, што вырабляецца ў агульных майстэрнях, перавышае 95 проц. прадукцыі ўсёй сыстэмы.

Займаючы салідное месца ў здабычы торфу, выпрацоўцы будматар'ялаў і інш., прамысловая каапэрацыя далёка немалаважную ролю адыгрывае ў галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня.

Саматужная прамысловая каапэрацыя мае вялікія магчымасьці — багацейшыя рэсурсы, мабілізацыя якіх можа даць дадатковыя і значныя таварныя масы для рабочага снабжэньня.

Работа пасобных райсаюзаў і некаторых арцеляй паказвае, што ў радзе зьвеньняў каапэрацыі ўжо навучыліся выпускаць далатковы сырэц, разгортваюць па-за плянавых закупкі, дабіваюцца перавыкананьня вытворчых праграм і гэтым павялічваюць таварныя масы.

Аднак, рашаючага зруху ў галіне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў саматужна-прамысловая каапэрацыя яшчэ не дабілася. Гэта асабліва ярка відаць, калі прааналізаваць лічбы выкананьня прамфінпляну за 9 месяцаў бягучага году.

Пры агульным яўна незадавальняючым выкананьні галавога пляну (57,2 проц.) асабліва адстае тая частка прамысловасьці, што выпрацоўвае тавары шырокага спажываньня.

Па мэталапрацоўцы, куда ўваходзіць выраб лоскаў, мэталёвай посуды і інш., плян выкананы усяго на 52,9 проц. Па галянтарэі ў сярэднім на 37,5 проц., па трыкатажы — 43,5 проц., па рамонце вопраткі — на 24 проц. і абутку — 52,7 проц. Характэрна адзначыць, што пры такім нізкім процанце рамонту абутку выраб новага дасягае 89 проц. Гэта між іншым зьяўляецца характэрнай рысай для ўсіх відаў выпускавай прадукцыі. Атрымліваецца так, што выкананьне пляну па дэфіцытнай групе стаіць некалькі вышэй недэфіцытнай.

Пасьля гэтага становіцца ясным, што прычына невыкананьня пляну — у першую чаргу ў самой каапэрацыі.

У лістах СНК БССР указаў, што «асноўнымі недахопамі ў рабоце прамысловa-каапэрацыйнай сыстэмы зьяўляюцца: а) значнае аслабленьне ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы прынцыпаў гаспадарчага разрахунку; б) невыстарчальная работа па здабычы, скарыстаньні мясцовага сырцу, па скарыстаньні ўціхло і адыходаў, па ўцягненьні сырцу заказчыка... д) залішняя цэнтралізацыя, якая зьмяшае вытворчую ініцыятыву і самадзейнасьць каапэрацыйных мас...»

Перабудаваўшыся арганізацыйна, стварыўшы галінавыя аб'яднаньні, прамысловая каапэрацыя не дабілася яшчэ за сутнасьці ліквідацыі да канца бюракратычнай цэнтралізацыі. Гаспадарчага разрахунку фактычна няма. Сродкі скапцентраваны і абязьлічаны ў райсаюзах. Арцель пя мае яшчэ магчымасьці рабіць самастойныя апэрацыі. Толькі зараз арцелям прадастаўлена права мець свае бягучыя рахункі ў райсаюзах.

Рэалізацыя шасьці ўмоў т. Сталіна ў частцы ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі, па заявах кіраўніцтва Белсампрамсаюзу, знаходзіцца... у працэсе распрацоўкі. У практыцы ўкараненьня зьдзельнічыны дапушчаны грубыя скажэньні. Яны выражаюцца ў насаджэньні групавой зьдзельнічыны, што па сутнасьці азначае ўраўнілаўку.

Выканаць задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам, прамкаапэрацыя здолее толькі пры абавязковай умове перабудовы сваёй работы зьверху да нізу.

У першую чаргу гэта азначае ўкараненьне сапраўднага гаспадарчага разрахунку і зьдзельнічыны.

Зматаючыся супроць «утрыманчых» нэпэцкіх, спадзяваньня на цэнтр, не зьходна разам з тым хутчэй разьвязаць ініцыятыву нізавых арганізацый в галіне фінансаваньня.

Выпусканьне дадатковых крыніц для мабілізацыі мясцовых рэсурсаў, разгортваньне па-за плянавых закупак, усямернае стымуляваньне вытворчасьці — усё гэта важнейшыя пытаньні работы, асабліва для тых арцеляй, што выпускаюць тавары шырокага спажываньня.

Даўно пара Белсампрамсаюзу пытаньне аплаты працы — ліквідацыі ўраўнілаўкі — перанесьці з «працэсу распрацоўкі» ў практыку работы кожнай арцелі. Тое-ж самае трэба сказаць і ў адносінах абязьлічкі. Час нарэшце дабіцца таго, каб старшыня праўленьня арцелі і адказны работнік майстэрні быў у поўнай меры кіраўніком свайго прадпрыемства.

Асаблівасьці сыстэмы прамкаапэрацыі, у адрозьненьне ад дзяржаўных гаспадарчых арганізацый, ні ў якім выпадку не выключаюць магчымасьці і неабходнасьці ліквідацыі абязьлічкі, устанаўленьня поўнай адказнасьці і разьвязваньня ініцыятывы кіраўнікоў. Спасыланьне ў такіх выпадках на «асаблівасьці» ёсьць нішто іншае, як прыкрываньне абязьлічкі і санкцыя на безадказнасьць.

Прамысловая каапэрацыя БССР не павярнулася яшчэ тварам да разгортваньня савецкага гандлю. **Пастанова СНК аб адкрыцьці 21 магазыну ня выкананa.** Ніякія захады ня ўжыты яшчэ Белсампрамсаюзам да разгортваньня раздробнага гандлю ў сувязі з пастановай кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).

Гандлёвая сетка прамкаапэрацыі надзвычай непаваротлівая. Ніякай ініцыятывы ў разгортваньні самазагатовак крамы не праяўляюць. Тут з асаблівай сілай даюць сябе адчуваць тэндэнцыі механічнага разьмеркаваньня тавараў. Па гэтай прычыне гандлёвая сетка прамкаапэрацыі выканала заданьні па таваразвароце ўсяго на 25 проц. Ня выжыт таксама «нэпманскі дух». Ён знаходзіць яркае праяўленьне ў ігнараваньні патрэб спажыўца, у пагардлівых адносінах да гандлю такімі таварамі (драўняныя, гончарныя вырабы і інш.), якія не даюць «вялікіх прыбыткаў».

Посьпехі ў разгортваньні раздробнага гандлю залежаць галоўным чынам ад таго, наколькі энэргічна ў сыстэме прамкаапэрацыі будзе весьціся барацьба з непаваротлівасьцю, інэртнасьцю, з буржуазным гандлярствам, за ўсямернае разьвязваньне ўласнай ініцыятывы, за поўнае выкарыстаньне мясцовых рэсурсаў.

Немалаважную ролю ў справе мабілізацыі дадатковых рэсурсаў можа адыграць адпаведная пастаноўка работы па закупцы тавараў, якія вырабляюцца саматужнікамі-адзіночкамі. Між тым гэта скрозь і ўсюды недаацэньваецца. Тут яшчэ арудуе прыватны скупшчык.

Марудныя тэмпы перабудовы работы зьяўляюцца асноўнай прычынай не здавальняючай работы прамкаапэрацыі. Аднак, было-б памылкай абыходзіць моўчкі другія прычыны, якія зусім ня спрыяюць пасьпяховаму разьвіцьцю прамкаапэрацыі.

Аб недаацэнцы гэтай сыстэмы з боку шмат якіх гаспадарчых і асобных партыйных арганізацый гаворыць далы рад фактаў. У Бабруйску, Мазыры і інш. раёнах не бяз ведама кіруючых арганізацый прадпрыемствы прамкаапэрацыі пераманьваюцца дзяржаўнай прамысловасьці. Члены арцеляй перакідваюцца і пераманьваюцца іншымі арганізацыямі. У некаторых мясцох справа дайшла нават да ліквідацыі па асобных арцеляй.

Перабой ў рабоце прамкаапэрацыі пад час стварацца і па віне арганаў снабжэньня. Наркамснаб і асабліва Лесбел сыстэматычна ня выконваюць нарадаў прамкаапэрацыі.

Падкрэсьліваючы гэта, цельга ні ў якай ступені паменшыць віну самой прамкаапэрацыі за невыкананьне прамфінпляну. **Тут асаблівы ўпор трэба зрабіць на якасьць.** Яна па сыстэме прамкаапэрацыі надзвычай нізкая. Таму ліквідацыя гэтай «ганебнай плямы» павінна быць пастаўлена ў разрад актуальнейшых задач.

Прамысловую каапэрацыю трэба рашуча павярнуць тварам да задач рабочага снабжэньня, да задавальненьня патрэб працоўнага спажыўца.

Ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, перабудову работы на аснове гаспадарчага разрахунку трэба перанесьці з габінэтаў, з рэзалюцый і шматлікай гаварыльні ў нізавыя зьвеньні і ператварыць іх у практыку штодзённай работы прамысловай каапэрацыі.

ШКЛОЎСКАЯ МТС ЯШЧЭ НЯ СТАЛА АРГАНІЗАТАРАМ ІЛЬНААПРАЦОЎКІ

Змагаючыся з кулацкімі, рвацкімі тэндэнцыямі і асяданьнем ільну, множыць рады калгасаў, датэрмінова скончыўшых пераапрацоўку і здачу дзяржаве тэхкультур

Разьбіць кулацкія манэўры ў калгасах „Новы шлях" і „Новае жыцьцё"

ШКЛОЎ. (Ад нашага спэцкор.). Першыя 10 дзён месяцніка па апрацоўцы і здачы ільну дзяржаве не далі належнага зруху па калгасах, якія абслугоўваюцца Шклоўскай МТС.

На 20 лістапада плян па здачы ільна трасты выкананы на 1,8 проц. (на 15 было 1,2 проц.), ільнасаломы на 4,6 проц. (было 0,4 проц.) і ільнавалакна на 2 проц. (было 1,7 проц.). Як відаць, тэмпы загатовак ільнапрадукцыі зусім павольныя і не гарантуюць выкананьня пляну на 70 проц. да 10 сьнежня.

На здымку Бракаўшчык па прыёмным пункце вызначае якасьць ільна валакна.

Значная частка ільну па калгасах МТС яшчэ не абмалочана. У буйнейшым калгасе «Барацьба», Нова-Брашчылскага сельсавету, абмалочана толькі 30-35 проц. усяго ільну з плошчы больш 100 гэкт.

У некаторых калгасах агенты кляса-вага ворага імкнуцца распаліць спажывецкія тэндэнцыі сярод адсталай часткі калгасьнікаў для таго, каб сарваць апрацоўку ільну і здачу дзяржаве. У калгасе «Новы шлях», Камена-Лаўскага сельсавету 40 гэкт. неаграмаджанага ільну ўжо апрацавана (нават атропана); з гэтай колькасьці ніводнага кілё дзяржаве ня здана. У гэты-ж самы час аграмаджаны лён з 45 гэкт. нават не абмалочаны. У кіраўніцтве гэтага калгасу заселі кулакі і заможнікі, якія ўсякім чынам імкнуцца ўзарваць калгас з сярэдзіны. Наогул калгас засьмечан клясава-варожым элемэнтам.

У калгасе «Новае жыцьцё», Нова-Брашчанскага сельсавету, частку лепшай ільнасаломы ўжо забраніравалі для разьмерзваньня сярод калгасьнікаў, ня выканаўшы плян здачы дзяржаве. А ў калгасе імя Буйзённага, Гарадзішчанскага сельсавету, уласны лён дрэнна якасьці абагулілі з тэй мэтай, каб калектыўны, добрай якасьці, падзяліць паміж калгасьнікаў.

МТС мае ўсе магчымасьці для таго, каб ісьці на перадавой лініі ў барацьбе за лён. Апарат МТС такі: 5 агранамаў, 10 паляводаў і 11 калёнаважатых. Гэтыя сілы могуць мабілізаваць масы калгасьнікаў на разгортваньне апрацоўкі ільну. **Аднак, сырэцкая МТС не скарыстоўвае ўсіх тых магчымасьцяй, якімі яна ўладае.**

Дзьве 6-параваньныя ільнамялкі стаяць на складзе МТС. Калгасы не забіраюць іх і тлумачаць гэта дрэнпай дарогай. Дырэкцыя МТС ня ўжыла рашучых захадаў, каб прасунуць гэтыя машыны і даць ім поўную нагрузку. **Таксама стаяць на складзе 14 трапальных колаў,** якія нават не разьмеркаваны сярод калгасаў.

Трэба ўдзесяцярыць тэмпы апрацоўкі ільну і здачы прадукцыі дзяржаве. **Даючы бязьлітасны руйнуючы адпор буржуазным тэндэнцыям — забясьпечыць здачу 70 проц. ільнапрадукцыі да 10 сьнежня!.**

За злачыннае нескарыстаньне ільна апрацоўчых машын вінаватыя з шклоўскай МТС павінны атрымаць па заслугах.

Б. Харыт.

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

кандыдатаў на прэміяваньне за датэрміновую апрацоўку і здачу тэхкультур дзяржаве

№№	НАЗВА КАЛГАСУ	Назва раёну	Проц. выкананьня
1	«Прыют»	Шклоўскі	119
2	«Ільніч»	Лёзьненскі	100
3	«Чырвоны пуцілавец»	»	100
4	Калгас вёскі Хоўні	Дубровенскі	110
5	» » Карупы	»	100
6	«Чырвонае Чубакова»	»	100
7	Калгас імя Гайдзеда	Мсьціслаўскі	100
8	«Пагранічнік»	Кушнер	100
9	«Камунар»	»	115

За 10 дзён месячніка выкананa 87 проц. пляну загатовак

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Прыклад ударнай работы па пераапрацоўцы ільну паказвае калгас «Чырвоная Асея». Па скончэньні ўборкі тэхкультур былі створаны спэцыяльныя брыгады па сушцы, мяцьці і трапаньні, якія паміж сабой заключылі ўмовы па сацыяборніцтва.

У выніку добра арганізаванай работы па пераапрацоўцы ільну на 20 лістапада плян загатовак выкананa на 87 проц., дзяржаве здана 525 кгр. валакна.

Я. Ж.

Загатоўкі сьвіней—найбольш адсталы вучастак

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ЖЫЗЁЛАЗАГАТОВАК ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ.—РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З МЕСЬНІЦТВАМ РАДУ РАЁНАЎ

Нездавальняючыя вынікі

Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР плян загатовак жывёлы ў IV квартале цавіцца быць выкананa да 1-га сьнежня на 70 проц. Паводле даных на 20-га лістапада, па БССР загатоўлена толькі 41,6 проц. заданьня. Такім чынам, мы маем яўна нездавальняючае становішча на вучастку загатовак жывёлы.

Адна з прычын невыкананьня пляну — гэта позьняе давядзеньне заданьняў да вёсак і калгасаў. Ня гледзячы на пастановы вышэйшых органаў — спусьціць пляны ў нізоўку не позьней 10-га кастрычніка, многія раёны пачалі рэалізацыю плянаў толькі пасьля 20-га, а ў радзе месц заданьні не давядзены да вёсак і дагэтуль. У Старадарожскім, Жыткавіцкім, Жлобінскім, Капыльскім, Крупскім, Гарадоцкім раёнах панує бюракратычны спакой, загатоўшчыкі займаюцца апартуністычнай балбатнёй на тэму: «Мы пасьпеем яшчэ займацца гэтай кампаніяй».

Кіруючыя арганізацыі гэтых раёнаў і загатоўчыя сыстэмы не зразумелі значэньня загатовак жывёлы ў адносінах рабочага забесьпячэньня і пашырэньня мяса-кансэрвовай прамысловасьці.

Ёсьць раёны, напрыклад, Чырвонапольскі, Тураўскі, Уваравіцкі, Старадарожскі, дзе дагэтуль выкананa менш 25 проц. квартальнага заданьня. Апошняя пяцідзёўка дала ганебнае зьніжэньне тэмпаў.

Зараз загатоўкі праходзяць у асноўным выключна за лік буйной рагатай жывёлы. У радзе месц — Бягомльшчыне, Лагойшчыне — квартальныя пляны па здачы буйной жывёлы перавыкананы, а загатоўкі сьвіней разгортваюцца недапушчальна марудныя тэмпамі. Гэта лішні раз сьведчыць аб самацёку ў рабоце загатоўчых арганізацый.

Квартальны плян загатовак сьвіней выкананa па БССР толькі на 10 проц.

Сацыялістычны сэктар вёскі адыгрывае рашаючую ролю ў выкананьні пляну 1931-32 г. — удзельная вага яго звыш 50 проц. Між тым СТКФ недапушчальна адстаюць у загатоўках жывёлы. Загатоўчыя арганізацыі не праводзяць ніякай работы вакол загатовак сьвіней у СТКФ. Досыць адзначыць, што сыстэмы Белхлебжывёласаюзу і Белкаапсаюзу на працягу паўтара месяца не заключылі ніводнага дагавору з фэрмамі на атрыманьне таварнай мясной прадукцыі.

Вялікае значэньне ў кампаніі жывёлазагатовак набывае кантрактацыя жывёлы. У мэтах фарсаваньня тэмпаў загатовак яшчэ ў першыя дні кастрычніка было разьмеркавана паміж загатоўчымі арганізацыямі больш 1 млн. руб. для выдачы авансаў калгасам і калгасьнікам, што кантрактуюць жывёлу. Крэдыты не скарыстоўваюцца, раённыя загатоўчыя арганізацыі зусім не разгарнулі гэтай работы. Звод ка на 15-га лістапада прыводзіць ганебныя лічбы — толькі 360 штук жывёлы закантрактавана загатоўчымі сыстэмамі. Між тым, да 1-га студзеня 1932 г. трэба закантрактаваць ня менш 75 проц. жывёлы, якая павінна быць здана ў будучым годзе.

Трэба мабілізаваць усю вясковую грамадзкасьць на выкананьне пляну загатовак жывёлы, трэба шырока разгарнуць масава-растлумачальную работу, каб дабіцца поўнага і своечасовага выкананьня заданьняў па загатоўках сьвіней і кантрактацыі.

П. К.

ВУДЗА і ПУХАВІЧЫ РАЗБАЗАРВАЮЦЬ МЯСА

Наркамснаб забараніў загатаўляць жывёлу каму-б там ні было, за выключэньнем асноўных загатоўчых сыстэм—спажывецкай і хлебажывёлаводчай каапэрацыі. Раёны строга разьмеркаваны паміж абедзьвюма арганізацыямі.

Між тым ёсьць факты парушэньняў пастановы Наркамснабу; у радзе месц, дзе асноўным загатоўшчыкам жывёлы зьяўляецца райкаапсаюз, спажывецкая сыстэма праз свае таварыствы на вёсцы скупляе жывёлу, забівае яе і разбазарвае на мясцовыя патрэбы бяз усякай чэргі.

Пухавіцкі райкаапсаюз даў распараджэньне калгасам (з ведама райснабу) здаць для мясцовых патрэб сельскім спажывецкім таварыствам 100 авечак у той час, як квартальны плян па загатоўках авечак выкананы Пухавіцкім раёнам толькі на 20 проц.

Зенькавіцкае спажывецкае таварыства, Вузьдзенскага раёну, скупляе жывёлу па павышаных цэнах і выдае необмежаваную прэмію здатчыкам.

Такія-ж зьявішчы наглядаюцца і ў іншых вёсках Вузьдзеншчыны. Вузьдзенскі райкаапсаюз зьвярнуўся да райснабу тав. ПАЛОЙКА з просьбай ліквідаваць разбазарваньне жывёлы, бо гэта тармозіць загатоўкі жывёлы для патрэб забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў. Палойка адказаў: «Трэба ўступіць сельскім спажывецкім таварыствам, яны кормяць масцовае насельніцтва». Так Вузьдзенскі райснаб «разгулюе «газатоўкі жывёлы.

Органы НК-РСІ і прокуратуры павінны прыняць меры да спыненьня пазапланавага выдаткаваньня мяса-прадуктаў на мясцовыя патрэбы.

Ж.

Не жадаюць „сварыцца" з кулаком

МАГІЛЕЎ. Да 20-га лістапада Магілеўскі раён загатовіў жывёлы толькі 56,7 проц. заданьня. За апошнія пяцідзёўкі квартальны плян выкананы на зусім нязначны процант.

Райснаб не мае вестак аб выкананьні цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадарнямі. Асабліва дрэнна выконваюцца цьвёрдыя заданьні па сьвіньнях. Па Мастоцкім сельсавеце кулакі здалі 26,4 проц. заданьня па сьвіньнях, па Рафалаўскім—15,8 проц., па Цішоўскім—17 проц.

У той час, як плян здачы рагатай жывёлы выконваецца больш-менш здавальняюча, загатоўкі сьвіней ідуць выключна дрэнна. Значная частка сельсаветаў нічога ня робіць, каб фарсаваць загатоўкі сьвіней, гэтым яны дапамагаюць кулацтву, якое імкнецца сарваць укамплектаваньне сьвінгадоўчых таварных фэрм.

Загатоўкі сьвіней трэба паставіць у цэнтры работы загатоўчых сыстэм.

Брыгада «Зьвязды»:

ПРАХАРЭНКА. СКАПЕЦ.

АБ РАБОЦЕ ЗБОЖЖАВЫХ САЎГАСАЎ

Зробленае праверачнымі камісіямі абсьледваньне работы саўгасаў Збожжасаўгасаб'яднаньня і іншых сыстэм (за выключэньнем «Союзсахара») выявіла абураючую безгаспадарчасьць і недапушчальна злачынныя адносіны да дзяржаўнай маемасьці:

а) агідна вялікія страты пры ўборцы, абмалоце і перавозцы ўраджаю;

б) адсутнічае сапраўдны ўлік збожжа;

в) збожжа расходуецца па зусім незаконных нормах, якія ў радзе выпадкаў амаль у два разы перавышаюць устаноўленыя для першаразрадных прадпрыемстваў у горадзе;

г) ураджаі перапамяншаюцца, і сапраўдныя разьмеры збожжавых рэсурсаў запісваюцца няправільна ў збожжа-фуражны баланс;

д) абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве разглядаліся кіраўнікамі саўгасаў, як другарадная задача, выкананьне якой можна адкласьці да поўнага задаваленьня патрэб сваёй гаспадаркі;

е) якасьць апрацоўкі зямлі зусім пездавальняючая, і высокая тэхніка, якая ёсьць у саўгасах, зусім невыстарчальна імі выкарыстоўваецца для павышэньня ўраджайнасьці.

Усе гэтыя факты парушэньня ўказаньняў СНК і ЦК маюць месца ў большасьці саўгасаў побач з пасобнымі саўгасамі, кіраўнікі якіх па-бальшавіцку вядуць барацьбу за ўмацаваньне саўгасаў, выкананьне пляну здачы збожжа дзяржаве і якасьць вытворчай работы.

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. За безгаспадарчае вядзеньне справы і няўменьне арганізаваць здачу збожжа ў саўгасах, у рэзультаце чаго рад саўгасаў Збожжасаўгасаб'яднаньня самавольна зьменшылі ўстаноўленыя для іх пляны здачы збожжа і безгаспадарча зглумілі дзяржаўнае збожжа, — зьняць тав. Герчыкава з пасты старшыні Збожжасаўгасаб'яднаньня.

2. Прапанаваць Наркамзему СССР пакласьці адміністрацыйныя спагнаньні па работніках сыстэмы Збожжасаўгасаб'яднаньня, насеннаводчых і іншых трэстаў, у рабоце якіх праверачнымі камісіямі выкрыты безгаспадарчасьць і няўменьне змагацца за здачу збожжа.

3. Расходаваньне саўгасамі харчоў і кармоў у разьмерах, якія перавышаюць устаноўленыя нормы, дічыць крымінальна-пакаральным злачынствам.

4. Назначыць у кожным саўгасе спэцыяльнага кантралёра Наркамзему СССР, не залежачага ад дырэктара саўгасу і трэсту і падпарадкаванага непасрэдна Наркамзему СССР, па абавязкі якога ўскладзьці праверку справы ўліку ў саўгасе, штодзённы нагляд за правільным хаваньнем прадукцыі саўгасу, за захаваньнем норм расходаваньня харчоў і кармоў, за выкананьнем саўгасам сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай па здачы прадукцыі.

Кантралёрам зьнята права прыняцьця незаконных распараджэньняў адміністрацыі.

5. Прапанаваць Наркамзему СССР у двухмесячны тэрмін скончыць рэарганізацыю збожжавых саўгасаў на падставах, устаноўленых у пастанове Наркамзему СССР ад 25 жніўня, зацьверджанай СНК і ЦК, вядучы рашучую барацьбу з усімі спробамі абыйсьці гэту пастанову.

6. Пры ажыцьцяўленьні рэарганізацыі збожжасаўгасаў выходзіць з таго, што важнейшай умовай паляпшэньня работы ў збожжасаўгасах зьяўляецца ператварэньне пяперашняга «вучастку» саўгасу ў поўнапраўнае аддзяленьне саўгасу са спэцыяльным кіраўніком на чале, з пастаянным складам агранамічнага, тэхнічнага і рабочага персаналу, з пастаянным складам машын і прылад, якое будзе сваю вытворчую работу па пачатках гаспадачага разрахунку, пры значачасовым захаваньні адзінай саўгаснай рамонтнай базы, апарату снабжэньня і захаваньні за дырэктарам саўгасу права распараджэньня вытворчымі рэсурсамі (машыны і інш.) саўгасу ў цэлым.

7. У мэтах умацаваньня кадраў кіраўнікоў аддзяленьняў саўгасу ўстановіць, што кіраўнікі аддзяленьняў саўгасу назначаюцца і зьнімаюцца дырэктарам саўгасу толькі пасьля зацьверджэньня трэсту.

8. Прапанаваць Наркамзему СССР аналёгічныя мерапрыемствы правесьці ў пасеннагадоўчых трэстах, у Прамсаўгастрэсьце і ў іншых трэстах, саўгасы якіх вырошчваюць таварна збожжа.

9. Партыйным і савецкім арганізацыям падалей сурова кіравацца зацьверджаным ЦК і СНК парадкам, пры якім дырэктары саўгасаў і машына трактарных станцый зьмяншаюцца і назначаюцца выключна са згоды НК СССР.

10. Абавязаць «Правду», «Известия», «Социалистическое земледелие» і мясцовы друк сыстэматычна асьвятляць, крытыкаваць і заахвочваць работу пасобных саўгасаў таксама, як гэта робіцца цяпер у адносінах заводаў і фабрык.

11. Назначыць старшынёю Збожжасаўгасаб'яднаньня тав. Юрэвіча.

Старшыня СНК Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

27-га лістапада 1931 г.

Неадкладна рэалізаваць таваркыя астачы

Кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б) падкрэсьліў, што «ўнутраны распарадак у большасьці магазынаў і якасьць гандлю ўсё яшчэ знаходзяцца ў нездавальняючым становішчы і ўсё яшчэ ня зьнішчана замарожваньне тавараўвароту».

Пасьля апублікаваньня пастановы пленуму ЦК прайшоў месяц. Час праверыць, як каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі рэалізуюць пастановы пленуму і, у прыватнасьці, як яны змагаюцца за павышэньне якасьці гандлю, за паскарэньне таваразвароту, супроць яго замарожваньня.

Лічбовыя даныя аб таваразвароце па сыстэме спажывецкай каапэрацыі прыводзяць да вываду, што ў галіне якасьці гандлю і таваразвароту няма дзейснай бальшавіцкай барацьбы.

На 1-га кастрычніка астача тавараў складала суму ў 10.874 тысячы рублёў. За месяц работы астача паменшана толькі на 2 мільёны. На сёньняшні замарожаных тавараў па сыстэме спажывецкай каапэрацыі ёсьць на 8.452 тысячы, з іх на адзін з лішкам мільёны няходкіх тавараў.

У чым прычына?

Асноўная прычына заложана ў «няўменьні значнай праслойкі работнікаў каапэрацыйна-гандлёвага апарату перайсьці з рэек механічнага разьмеркаваньня тавараў на рэйкі разгортваньня савецкага гандлю» (кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б). Паяўнасьць бюракратычных элемэнтаў і праяў «нэпманскага духу» ў апараце раду зьвеньняў каапэрацыі не ў малой ступені таксама садзейнічаюць замарожваньню таваразвароту.

Ігнараваньне патрэб спажыўца, пагоня за «высокімі прыбыткамі» ў адным выпадку, і інтэртнасьць, нежаданьне крануцца з пункту разьмеркаваньня таго, што дае цэнтр—у другім, агульным сваім выніку прыводзяць да грубага парушэньня вызначаных тэрмінаў звароту тавараў.

Аб гэтым выразна гавораць лічбы.

Устаноўлены плянам тэрмін звароту тавараў у 18,5 дзён амаль па ўсіх лініях злачынна парушаецца. Прадэ звароту тавараў па райспажыўсаюзах і лесрабкопах (паводле даных на верасьня 1931 году) дасягнуў 30 дзён па торфрабкопах—36 дзён. За кастрычнік па райспажыўсаюзах—27 дзён, торфрабкопах—30, і лесрабкопах—5 дзён.

Некалькі лепш працуе гарадзкая сетка. ЗРК і ларабкомы амаль не парушаюць тэрмінаў, за тое гарспажыў таварыства, розьнічныя аб'яднаньні і ЗВК працэс таваразвароту расьцягваюць на такі тэрмін, які ў 1, 5 і 2 разы перавышае плян.

Асноўны цяжар затаварваньня падае на сельскую сетку. Астача тавараў у 6 мільёнаў руб.—паказальнік марудной перабудовы работы сельскага зьвяна. Тут справа ў першую чаргу ўтіраецца ў гаспадарчы разрахунак і зьдзельнічыну. 6 мільёнаў астачы —гэта вельмі яркая характарыстыка таго, што па сыстэме райспажыўсаюзаў няма сапраўднага кантролю рублём, не ўстаноўлена матар'яльная зацікаўленасьць работнікаў прылаўку ў павялічэньні таваразвароту.

Вынікі напрашваюцца самі. Яны павінны заключацца ня толькі ў тым, каб неадкладна ліквідаваць затаварваньне і з большай настойлівасьцю ўзяцца за перабудову работы, за ператварэньне з апарату каапэрацыі «нэпманскага духу» і гандэцкі механічнага разьмеркаваньня, але і ў больш жорсткіх мерах у адносінах да кантрактных работнікаў, якія з халадком адносяцца да выкананьня дырэктыў партыі.

На заключным пасяджэньні зьезду жанчын-калгасьніц

У канцы ранішняга пасяджэньня 29 лістапада на зьезьдзе выступіў з вялікай прамовай, сустрэты бурнымі воплескамі дэлегатак, старшыня Саўнаркому БССР тав. Галадзед.

— На вечэрнім пасяджэньні 29 лістапада зьезд паслаў прывітальную тэлеграму генэральнаму сакратару ЦК УсеКП(б) — тав. Сталіну. Адзначыўшы дасягненьні калгасаў БССР у барацьбе за тэхнічныя культуры і сацыялістычную жывёлагадоўлю, калгасьніцы запэўнілі тав. Сталіна, што пасьля зьезду яны яшчэ з большай энэргіяй будуць змагацца на гэтых вучастках.

Зьезд зьвярнуўся з адозвай да ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц БССР, якой заклікае іх-бальшавіцку ўзяцца за падняцьце ўраджайнасьці сацыялістычных палёў і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Пасьля прыняцьця пастаноў па зазлуханых дакладах зьезд скончыў сваю работу.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Бязьлітасна змагацца з апартуністычнай недаацэнкай

ФАРМАЛЬНА-БЮРАКРАТЫЧНЫМ, ДЗЯЛЯЦКІМ ПАДЫХОДАМ ДА СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ПАРТОРГАНАЎ

Забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва

На арганпартнаразе ЦК КП(б)Б абмеркован ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў у Магілеўскай, Жлобінскай і Пухавіцкай раённых партарганізацыях.

У большасьці парт'ячэек Магілеўскай арганізацыі самаправерачная работа была разгорнута ў першых лічбах лістапада. Задачы перавыбарчай кампаніі шырока абмеркаваны на нарадзе сакратароў вытворчых парт'ячэек і асобна на нарадзе сакратароў саўгасных, калгасных і вясковых парт'ячэек. На агульных сходах рабочых, а таксама і сходах калгасьнікаў з удзелам бядняцка-серадняцкіх адпаасобных мас сталі даклады аб бліжэйшых задачах работы партарганізацыі.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы ячэек на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах праходзяць актыўна, з удзелам шырокіх беспартыйных мас. На прадпрыемствах Магілеўшчыны праведзены ўжо перавыбары амаль усіх пэхавых парт'ячэек. Справаздачна-перавыбарчая кампанія зьявілася магутным фактарам мабілізацыі камуністаў і беспартыйных мас на далейшую барацьбу за пасьпяховае выкананьне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, на барацьбу супроць апартунізму ва ўсіх яго праяўленьнях.

У вытворчых парт'ячэйках перавыбарчая кампанія праходзіць пад знакам поўнай рэалізацыі шасьці сталінскіх умоў. Пытаньні аўладаньня тэхнікай вытворчасьці, поўнай ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі, пытаньні гаспадарчага разрахунку, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, барацьбы за якасьць прадукцыі і інш. знайшлі шырокае адлюстроўваньне ў самаправерачнай рабоце вытворчых ячэек. Іменна ўпартай і настойлівай барацьбой за практычнае ажыцьцяўленьне гэтых пытаньняў забясьпечваецца выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Невыстарчальная барацьба парткалектыву фабрыкі штучнага шоўку за ліквідацыю вытворчых непаладак была асноўнай прычынай адставаньня фабрыкі ў выкананьні вытворчай праграмы. Фабрыка за першую дэкаду лістапада стаяла на ўзроўні 68.6 проц выкананьня пляну. У сувязі з разгортваньнем справаздачна-перавыбарчай кампаніі, у другой дэкадзе выкананьне пляну ўзьнімаецца ўжо да 93 проц.

На шэйнай фабрыцы за час перавыбарчай кампаніі арганізавана 18 гаспадарча-разрахунковых брыгад з ахопам 350 рабочых. У лізавых вытворчых зьвеньнях фабрыкі зараз створаны партгрупы. Перадавыя рабочыя, лепшыя ўдарнікі сацыялістычнай вытворчасьці падаюць заявы аб уступленьні ў партыю. На шэйнай фабрыцы падана 38 заяў аб уступленьні ў партыю і 160—у камсамол, на фабрыцы штучнага шоўку — 23 заявы ў партыю і 117 — у камсамол.

Аналягічнымі паказальнікамі ўзьліку творчага энтузіязму і палітычнай актыўнасьці рабочых мас суправаджаецца справаздачная кампанія і на другіх прадпрыемствах Магілеўшчыны.

У вёсцы з 28 парт'ячэек перавыбары адбыліся ў 8-мі ячэйках. Большасьць ячэек увязала справаздачна-перавыбарчую кампанію з задачамі ўзмацненьня работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній. Тры буйнейшыя калгасы, якія абслугоўваюцца Селіцкай парт'ячэйкай, высунулі сустрэчны плян збожжазагатовак і арганізавалі здачу чырвонымі абозамі ў часе перавыбараў. Калгас «Чырвоны сормавец» першым выканаў свой сустрэчны плян па загатоўках. Цішаўская парт'ячэйка забясьпечыла да дня перавыбараў поўнае выкананьне пляну загатовак збожжа і бульбы.

Доўгі час плялася ў хвосьце Бялыніцкая парт'ячэйка. Плян збожжазагатовак па 15/XI быў выкананы толькі на 28 проц., а зараз, у сувязі з разгортваньнем масавай работы па правядзеньні перавыбарчай кампаніі, ужо на 25/XI выканана — 75 проц. пляну загатовак збожжа.

Вельмі слабы ход выкананьня пляну загатовак наглядаецца там, дзе пануюць апартуністычныя адносіны да выкананьня дырэктыў партыі. Калгас «Ц'ня», Шчэдзіцкага сельсавету, зьяўляецца самым адсталым у выкананьні загатовак, і гэта не выпадкова. Былы сакратар ячэйкі Сарнацкі, праводзіў апартуністычную лінію ў сваёй рабоце, сабатаваў дырэктывы партыі па выкананьні загатовак. Райком і ячэйка рашуча ўдарылі па кулацкім агенце Сарнацкім, выключыўшы яго з партыі.

У параўнаньні з Магілеўскай арганізацыяй, слабей разгортваецца справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў у Жлобінскім раёне. Праўда, чыгуначны парткалектыў падышоў да перавыбараў са значнымі дасягненьнямі ў справе практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб рабоце транспарту. Аднак, усё-ж перавыбары не ператвораны ў баявую мабілізацыю мас на выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак.

З 10-ці чыгуначных парт'ячэек перавыбары праведзены ў трох, прычым у ячэйцы службы цягі перавыбары скаваны па тэй прычыне, што справаздачна-перавыбарчы сход прайшоў без належнага разгортваньня самакрытыкі і ў кіруючы орган выбраны людзі, якія нездольны выразна праводзіць лінію партыі. Па такіх-жа прычынах скасаваны перавыбары і ў ячэйцы лесазаводу. Перавыбары парторганаў у вёсцы невыстарчальна ўвязаны з мабілізацыяй мас на выкананьне пляну загатовак.

Арганпартнарада адзначыла палітычную недаацэнку важнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі з боку Пухавіцкага РК КП(б)Б. Гэта кампанія там па сутнасьці правалена. Замест бальшавіцкай мабілізацыі ўсіх ячэек на баявое правядзеньне перавыбарчай кампаніі парторганаў і выкананьне чарговых задач партыі, Пухавіцкі райком фармальна-бюракратычна аднёсься да гэтай важнейшай і адказьнейшай задачы. У сувязі з тым, што перавыбары ў радзе ячэек Пухавіцкага раёну праведзены бяз усякай падрыхтоўкі, фармальна, такія перавыбары неабходна скасаваць.

Вопыт і вурокі ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі у гэтых трох раёнах неабходна ўлічыць усім зьвеньням КП(б)Б. Райкомы КП(б)Б павінны забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва правядзеньнем гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. На хаду выкрываць недахопы і выпраўляць памылкі, мабілізаваць увагу партыйных мас па ўзмацненьне барацьбы супроць правааапартуністычнай практыкі, «лявацьких» загібаў і прымірэнцтва.

Выправіць памылкі

Пухавіцкі райком партыі не забясьпечыў сваім кіраўніцтвам падрыхтоўку і правядзеньне па раёне справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў. У сваёй пастанове па гэтым пытаньні РК КП(б)Б ня вызначыў канкрэтных мерапрыемстваў па правядзеньні гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. У пастанове няма ні аднаго слова аб задачах парт'ячэек у сувязі з перавыбарамі, перабудове партыйнай работы, ажыцьцяўленьні ўказаньняў тав. Сталіна, аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Для правядзеньня перавыбараў райком вылучыў 10 упаўнаважаных, якіх нават не праінструктаваў. Ні ячэйкам, ні ўпаўнаважаным ня было паказана, чым яны павінны кіравацца пры правядзеньні падрыхтоўкі да перавыбараў і справаздачна-перавыбарчых сходаў. Пераважная большасьць упаўнаважаных РК зьяўляліся ў прымацаваныя ячэйкі толькі на перавыбары, не дапамагалі ячэйкам правесьці належную падрыхтоўчую работу. Былі выпадкі, калі некаторым упаўнаважаным давалася заданьне за 4 дні правесьці перавыбары ў 4-х ячэйках.

Абыякія адносіны да справаздачна-перавыбарчай кампаніі праявіла і раённая газэта «За калгасы». 25-га кастрычніка яна зьмясьціла толькі адзін артыкул, прысьвечаны гэтаму пытаньню, прычым пабудавала яго на агульных разважаньнях, абмінаючы актуальнейшыя задачы парт'ячэек на вёсцы.

Усё гэта прывяло да таго, што значная частка ячэек раёну сарвала падрыхтоўку да справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў, не скарыстала яе для ажыцьцяўленьня важнейшых задач у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, арганізацыі загатовак і г. д. У 16 ячэйках да 25 лістапада закончыліся перавыбары. Толькі ў 3-х з іх была праведзена самаправерачная работа.

У саўгасе Вялень бюро партыйнай ячэйкі правяло «самаправерку» габітотным парадкам. Такое-ж становішча мела месца і ў чыгуначнай ячэйцы, сакратар якое тав. Ляхоніч заявіў: «Навошта нам праводзіць самаправерку, калі мы і так ведаем работу ячэйкі». У склад гэтай ячэйкі ўваходзіць загадчык аргаддзелу РК КП(б)Б тав. Ляскавец і старшыня РКК тав Залога, якія нічога не зрабілі для таго, каб дапамагчы ячэйцы, каб папярэдзіць у ёй зрыў падрыхтоўчай кампаніі.

У выніку ў радзе ячэек (калгас «Серп», «Дукора» і інш.) перавыбарчыя сходы прайшлі бяз удзелу мас.

Райком партыі павінен неадкладна выправіць дапушчаную памылку, жывым кіраўніцтвам і канкрэтнай дапамогай ячэйкам забясьпечыць шырокае разгортваньне масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас па ўцягненьні іх у справаздачна-перавыбарчую кампанію, мабілізаваць масы камуністаў і беспартыйных на выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач.

Леўчанка.

Адгаразіліся ад мас

Весялоўская парт'ячэйка (Барысаўскі раён) не падрыхтавалася да перавыбараў. У рэзультаце—на справаздачна-перавыбарчы сход зьявілася толькі 5 чалавек беспартыйных рабочых і 8 партыйцаў з агульнага ліку 18-ці членаў і кандыдатаў партыі.

Адсутнасьць работы па мабілізацыі мас вакол задач перавыбараў адмоўна адбілася на рабоце сходу. Самакрытыка ня была разгорнута ў той час, як у рабоце бюро рад буйных недахопаў. Бюро амаль не займалася пытаньнямі вытворчага характару, не перанесла цэнтру цяжару партработы ў брыгады, не вяло змаганьня супроць ураўнілаўкі і абязьлічкі, не займалися павышэньнем якасьці саўгаснай вытворчасьці. Ячэйка на чале з бюро не паставіла ў цэнтр увагі сваёй работы рэалізацыі 6-ці сталінскіх умоў.

Адсутнасьць бальшавіцкай крытыкі, адарванасьць ад мас у часе перавыбараў прывяла да таго, што ў бюро прылезьлі такія таварышы, якія ня могуць быць у кіруючым органе. У прыватнасьці, у бюро выбран тав. Язучык, у адносінах якога райком партыі нядаўна ставіў пытаньне аб выключэньні з радоў КП(б)Б. Перавыбары Весялоўскай ячэйкі павінны быць скасаваны. Неабходна, каб партыйная ячэйка поўнасьцю ажыцьцявіла дырэктывы ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў.

Рабочы.

Пад знакам барацьбы за павышэньне калгаснай вытворчасьці

Перавыбары парторганаў па Шклоўскім раёне праходзяць пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, датэрміновае выкананьне і перавыкананьне пляну загатовак.

У радзе сельсаветаў раёну (Славенскі, Нікіцінскі і інш.) партыйныя ячэйкі па-баявому справіліся з пастаўленай перад імі задачай. Дзякуючы правільнай расстаноўцы партыйных сіл і шырока разгорнутай рабоце па арганізацыі загатовак, калгасы Славенскага сельсавету перавыканалі плян збожжазагатовак па 247 проц., а аднаасобны сэктар—на 13 проц.

Значных выпікаў у гэтым напрамку дасягнула і Нікіцінская партыйная ячэйка, дзе да часу перавыбараў плян збожжазагатовак быў выкананы калгасамі на 119 проц. і аднаасобным сэктарам—на 97 проц. Нікіцінская ячэйка ліквідавана абязьлічка ва ўсёй сваёй рабоце, кожны член і кандыдат партыі прымацаваны да пэўнага калгасу і вёскі, кожны адказвае за правядзеньне тэй ці іншай работы.

Аднак, у некаторых ячэйках (Фашчаўская і інш.) перавыбарчыя сходы паказалі, што партыйныя ячэйкі гэтых сельсаветаў яшчэ не паставілі ў цэнтр сваёй работы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Партыйная арганізацыя Шклоўскага раёну павінна ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы гэтай вузлавой задачы і скарыстаць перавыбары парторганаў для далейшага ўздыму калгаснай вытворчасьці.

Я. Н.

У КОРАНІ ПЕРАБУДАВАЦЬ СЫСТЭМУ ЗАРПЛАТЫ НА ЛЕСАРАСПРАЦОЎКАХ

Зьнішчыць ураўнілаўку ў аплаце лесарубаў і возчыкаў. Перавесьці лясных рабочых на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну

Усю работу ў лесе—на брыгадныя мэтады

(На нарадзе пры НКП)

Нядаўна пры Наркампрацы адбылася нарада, прысьвечаная пытаньням ходу лесазагатовак, вярбоўкі рабгужсілы на лясныя работы і культурна-бытавога абслугоўваньня лесарубаў і возчыкаў.

З дакладаў прадстаўнікоў Леспраму, зробленых на нарадзе, выявіўся да волі сумны малюнак становішча загатовак лесаматар'ялаў і дроў.

Квартальнае заданьне па загатоўцы будаўнічых драўнін выканана на 26,5 проц., дроў — на 30,3 проц. Вывезена 5,1 проц. квартальнага заданьня па лесаматар'ялах і 7 проц. па апале.

Гэтыя нездавальняючыя вынікі тлумачацца, галоўным чынам, невыкананьнем дырэктыў партыі і 6 умоў тав. Сталіна аб перабудове мэтадаў працы і сыстэмы зарплаты, адсутнасьцю сыстэматычнага выразнага кіраўніцтва работай лясных вучасткаў.

Вярбоўка рабгужсілы праходзіць нездавальняюча. Паасобныя вёскі не грымацаваны да леспрамгасаў. Дагаворная кампанія праводзіцца фармальна, ня ўвязваецца з растлумачэньнем ільгот калгасьнікам, бедняком і серадняком—адыходнікам; ёсьць выпадкі затрыманьня адыходнікаў праўленьнямі калгасаў (Рэчыцкі раён), затрыманьня разьлікаў з паасобнымі калгасьнікамі (калгас «Ратайка», Барысаўскага раёну).

Плян набору рабочай сілы ў колькасных паказальніках выканан, але мала што зроблена, каб наладзіць культурна-бытавое абслугоўваньне і забясьпечэньне лясных рабочых, што тармозіць замацаваньне лесарубаў на работах і барацьбу з цякучасьцю.

Ёсьць выпадкі затрыманьня выдачы зарплаты больш чым на два месяцы. Плян адкрыцьця сталовак выкананы толькі на 40 проц. У лесарабкопах ня знойдзеш, напрыклад, каламазі, вельмі патрэбнай возчыкам. Наркамаховы здароўя амаль нічога не зрабіў, каб разгарнуць сетку мэдпунктаў у лесе.

Арганізацыя працы на лесазагатоўках яшчэ не наладжана. Досыць адзначыць, што брыгадамі ахоплена менш 1 проц. рабочых. Леспрамгасы не праведзены на гаспадарчы разрахунак. Не праведзена дыфэрэнцыяцыя працы па паасобных вытворчых працэсах, не наладжан сыстэматычны штодзенны ўлік выпрацоўкі і заработку кожнага рабочага, не арганізаваны тарыфна-нармовачныя бюро.

Існуючая на лесараспрацоўках сыстэма зарплаты норм і распэнак не стымулюе неабходнага ўздыму прадукцыйнасьці працы, узьнімацца кваліфікацыі і замацаваньня сталых кадраў. Не ўстаноўлены нормы работ для мэханізмаў. Наглядаецца поўная ўраўнілаўка ў адносінах аплаты адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Прэміяваньне абмежавана 15 проц. у адносінах да зарплаты. Існуе вялікая разьбежка паміж расцэнкамі на загатоўку драўляных асартыментаў і кругляка. Значна адстае аплата возчыкаў — рабочыя на дарожных работах атрымліваюць значна больш, чым па вывазцы лесаматар'ялаў.

У асноўным, выканаць плян лесазагатовак перашкаджаюць: самацёк у вярбоўцы рабгужсілы, абязьлічка ў арганізацыі працы і ўраўнілаўка ў зарплаце.

На нарадзе было падкрэслена, што асноўнай умовай пасьпяховага ажыцьцяўленьня плянаў работы лясной прамысловасьці зьяўляецца ніўхільнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна на лясных работах.

Трэба ў корані перабудаваць сыстэму зарплаты і працы на лесараспрацоўках, больш выразна і шырока праводзіць індывідуальную, неабмежаваную, прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну па ўсіх відах работ, зьвярнуць самую сур'ёзную увагу на перавод працы на лесазагатоўках на брыгадныя мэтады, ліквідаваць абязьлічку ў прымацаваньні паасобных рабочых да мэханізмаў і коняй, узмацніць вярбовачны апарат, арганізаваць ТНБ у леспрамгасах і нарэшце прыняць самыя рашучыя меры да паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых.



Лес для будаўніцтва ў саўгасе Чачэлічы.

ДА КАНЦА СПЛАВУ—ЛІЧАНЫЯ ДНІ

Паводле апошніх даных Лесбелу, праграма сплаву лесаматар'ялаў і дроў выканана на 55,4 проц.—пушчана ў сплаў 2.800 тысяч. Астача на прыстанях складае 0,7 проц. падвезенай колькасьці. Да канечных пунктаў прыбыло 89,4 проц. сплаўленай драўніны. Знаходзіцца ў сплаве яшчэ 118.000 кбм.

На першым месцы па выкананьні праграмы ідзе ВІЦЕБСКАЯ сплаўная кантора, якая падвезла да прыстаней 72,2 проц. пляну і сплавіла каля 99,2 проц. падвезенай колькасьці. Значна адстае Гомельскі вучастак, дзе да прыстаней дастаўлены каля 57 проц. праграмы.

Да канца навігацыі засталіся лічаныя дні. У вадзе знаходзіцца шмат лесаматар'ялу. Трэба прыняць самыя рашучыя меры, каб да падставу дасталіць сплаўлены лес да канечных пунктаў і выцягнуць яго на бераг. Ні адно бервяно не павінна застацца ў вадзе!

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК НЕ ДАВЕДЗЕН ДА ВУЧАСТКАЎ

ШКЛОЎ. (Наш кар.) Загатоўка і вывазка лесу па раёне ўвесь час праходзіць нездавальняюча. Партыйна-савецкія арганізацыі раёну не аддаюць лесазагатоўкам належнай увагі, праводзячы на практыцы тэорыю «чарговасьці кампаній». За кастрычнік вывезена толькі 1,2 проц. заданьня па будаўнічых матар'ялах і 2,7 проц. па апале.

Гаспадарчы разрахунак не даведзен да нізавых зьвеньняў лесазагатоўчай сыстэмы. Паасобныя вучасткі, дзялянкі і абозы ня маюць сваіх вытворчых плянаў. Ні на адным вучастку чы не атрымаеце выразнага малюнку сабекошту лясной прадукцыі.

Магілеўскі лесарабкоп ня цікавіцца забясьпячэньнем лесарубаў Шклоўскага вучастку. За прадуктамі і прамтаварамі часта прыходзіцца ісьці вельмі далёка. Гандлёвая сетка не даведзена да лесу.

Вельмі слаба працуе прафэсыянальная арганізацыя саюзу лесарабочых: спытай це любога лесаруба, як абслугоўваюцца культурныя патрэбы рабочых, і ён вам адкажа, што культработа ў лесе—пустое месца.

Нядаўна РайКК РСІ заслухала даклад Шклоўскага лесапрамгасу. Прызнаўшы становішча лесазагатовак нездавальняючым, КК-РСІ вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў для фарсаваньня тэмпаў загатоўкі і вывазкі лесу.

Н.

Мэханізацыя лясных работ—неадкладная задача

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове адзначыў вялізарнае значэньне мэханізацыі лесатранспарту. У БССР паводле пляну ў гэтым годзе павінна быць пабудавана лежнявых дарог на 120 клм. Пабудова гэтых дарог дае магчымасьці ня толькі асвоіць лясныя масывы, якія раней не эксплёатаваліся, але значна павялічыць вывазку. Сялянскі конь, які па звычайнай дарозе можа вывезьці ня больш 1 кбм. дроў, па лежнявой дарозе вывозіць 3½-4 кбм. Між тым, плян пабудовы лежнявых дарог да гэтага часу яшчэ ня выкананы.

Нездавальняюча ідзе будаўніцтва Дулебскай вузкакалейнай веткі, якая зьвязвае вялізарны лясны масыў з чыгункай. Уся падрыхтоўчая работа па пабудове чыгункі закончана. Не хапае балтоў і кастылёў, што зрывае пабудову важнейшай веткі.

Вялізарнае значэньне ў мэханізацыі вывазкі лесу на зімовы час набывае скарыстаньне вусенічных трактараў. Лесбел сваіх уласных трактараў мае толькі 4. У гаспадарчых арганізацыях (Трактарацэнтр, Галоўдартранс) ёсьць шмат трактараў, якія ў зімовы час стаяць без нагрузкі.

Лесбел ні раз зварачаўся ў Трактарацэнтр і Галоўдартранс з прапановай аб перадачы трактараў на зімовы час для лесавывазак.

Нізавыя зьвеньні гэтых арганізацый ахвотна згаджаюцца на перадачу трактараў леспрамгасам, але цэнтральныя кіраўніцтвы чамусьці марудзяць з заключэньнем дагавораў. Упаўнаважаны Трактарацэнтру на прапанову Лесбелу адказаў: «Трактараў нікому не дамо». Трэба памятаць, што кожны вусенічны трактар за зімовы час можа вывезьці 5-6 тыс. кбм. дроў.

Неабходна безадкладна высьветліць, якія трактары на зімовы пэрыяд не нагружаны, і перадаць іх у арэнду лясной прамысловасьці.

Мэханізацыя вывазкі ласьнь магчымасьць ліквідаваць запазычанасьць на вывазцы дроў.

П. Т.

Я. ІВАШЫН

Сельпарткомы ў сыстэме перабудовы партработы на вёсцы

Зараз у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў, якая праводзіцца пад лёзунгам узмацненьня баяздольнасьці кожнай ячэйкі КП(б)Б у барацьбе за далейшае ажыцьцяўленьне генэральнага пляну бальшавіцкай пяцігодкі, вясковым партарганізацыям неабходна ўсебакова вывучыць і падагуліць вопыт сельпарткомаў.

Стварэньне ў вясковых партарганізацыях сельпарткомаў — вялізарнейшай важнасьці мерапрыемства партыі ў справе канкрэтнага вырашэньня задачы забясьпечыць «МОЦНАЕ, ПРАВІЛЬНАЕ, КАНКРЭТНАЕ, УСЕБАКОВАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА КАЛГАСНАЙ ВЁСКАЙ» (Постышаў).

Цьвёрдай і пасьлядоўнай барацьбой за кіраўнільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх КП(б)Б забясьпечыла вялізарныя посьпехі і на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

БССР пакрыта шырокай сеткай саўгасаў, якія маюць спэцыялізаваны гаспадарчы напрамак. Больш паловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, аб'яднаўшыся ў калгасы, рашуча сталі на сацыялістычны шлях. Калгаснае селянства зьяўляецца зараз ня толькі асноўнай моцнай апорай партыі і ўлады на вёсцы, але і цэнтральнай фігурай зямляробства. На калгасных палёх Беларусі працуе 30 малатыла - трактарных станцый. У барацьбе за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, супроць клясавага ворага і яго агентуры—правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцтва — вясковыя парт'ячэйкі ўзмацніліся, вырасьлі і бальшавіцка загартаваліся. Іх работа значна палепшылася. Вядома, што ў мінулым ячэйкам вельмі рэзка адлюстроўвалася і адлюстроўваецца супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню з боку клясавага ворага. Вядома, што рад фактаў апартуністычнага скажэньня лініі партыі, рад нездаровых зьяўішч маюць месца і зараз у рабоце некаторых ячэек КП(б)Б. У вогуле-ж вясковая частка партарганізацыі, асабліва за апошнія гады, узмацнілася, і работа яе значна палепшылася.

Паколькі далейшая барацьба за ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі будзе праходзіць у новых умовах, пры абвостранай клясавай барацьбе, ад кожнай вясковай партарганізацыі, ад кожнай ячэйкі КП(б)Б патрабуецца павышэньне клясавай пільнасьці, паляпшэньне работы, канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць у кіраўніцтве калгаснай вёскай. Павархоўны падыход да вырашэньня канкрэтнай справы, прадастаўленьне справы самацёку, кіраўніцтва «наогул» не павінны мець месца. Кожная парт'ячэйка, кожны вясковы камуніст павінны ня толькі разумець сваю ролю ў сацыялістычным будаўніцтве, а дакладна ведаць канкрэтныя практычныя задачы работы сёньняшняга і заўтрашняга дня і дабівацца таго, каб гэтыя задачы таксама ведаў і добрасумленна выконваў кожны калгасьнік.

«Кожны калгасьнік і ў першую чаргу актывіст павінен ясна сабе прадстаўляць, што кожны лішні засеяны гэктар зямлі, у час засеянае і добра абробленае поле, а галоўнае—стопроцантнае выкананьне заданьняў па пасеве ўсіх культур, у тым ліку і тэхнічных, добрая арганізацыя ўборкі ўраджаю з мінімумам страт, кожны лішні пуд ураджаю з гэктара, стопроцантнае выкананьне загатовак збожжа, гародніны, мяса і г. д.—гэта ёсьць барацьба за сацыялізм, барацьба за пабудову сацыялізму, гэта ёсьць паляпшэньне снабжэньня рабочых, якія будуюць новыя заводы выробляюць камбайны, трактары, прычэпныя прылады, барштаты і машыны для нашай сацыялістычнай гаспадаркі, гэта ёсьць удар па клясавым ворагу...» (Постышаў).

Дасягнуць такога разуменьня сваіх задач калгаснымі масамі, па-бальшавіцку мабілізаваць іх на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на барацьбу за якасны рост калектыўнай гаспадаркі—асноўная задача кожнай ячэйкі, сельпарткому і райкому КП(б)Б. Для гэтага патрэбен сапраўдны паварот кожнай вясковай парт'ячэйкі тварам да калгаснай вытворчасьці, сапраўдная перабудова партыйнай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, аб якіх гаварыў тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў. Патрэбна сыстэматычная масавая работа па выхаваньні калгасьніка, каб дапамагчы яму хутчэй зжыць дробна-ўласьніцкую псыхалёгію і ператварыць яго ў сапраўднага трудзяніка сацыялістычнага грамадзтва.

Адным з мерапрыемстваў у ажыцьцяўленьні гэтых задач, мерапрыемствам паляпшэньня работы калгасных ячэек і ўзмацненьня партыкіраўніцтва калгасамі ў цэлым і зьяўляецца арганізацыя сельпарткомаў. СПК, як правіла, арганізуецца пры ячэйках саўгасаў, МТС, якія даволі ўзмацніліся, маючы ў сваім складзе пераважна пралетарскае ядро, і пры ячэйках буйнейшых калгасаў. Іменна такія ячэйкі павінны быць апорнымі для сельпарткомаў, а да іх прымацоўваюцца калгасныя ячэйкі. Апорныя ячэйкі саўгасаў і МТС у адносінах да прымацаваных ячэек павінны адыгрываць ролю, прыкладна, заводзкага парткамітэту. Ячэйкі апорных пунктаў, працуючы пад непасрэдным кіраўніцтвам сельпарткомаў і як найбольш моцныя, павінны дапамагаць прымацаваным калгасным ячэйкам і спразай і парадай ў гаспадарчых, палітычных і культурных пытаньнях. Практычна гэта ажыцьцяўляецца шляхам правядзеньня сходаў ячэек апорных пунктаў сумесна з сакратарамі ці актывам прымацаваных ячэек, вылучэньня таварышоў для пэрыядычнай дапамогі прымацаваным ячэйкам, правядзеньня сумесных сходаў усіх ячэек, якія абслугоўваюцца сельпарткомамі і г. д.

З часу арганізацыі сельпарткомаў не прайшло яшчэ 4-х месяцаў. Тым ня менш гэтае мерапрыемства дало даволі вялікія станоўчыя вынікі ў справе паляпшэньня работы калгасных ячэек. Дзе правільна праведзена арганізацыя сельпарткомаў, удала падабраны кіруючы склад, правільна ўсьвядомлена значэньне сельпарткомаў раённым парткіраўніцтвам,—там рэзультаты партыйнай работы адзначаюцца бліскучымі паказальнікамі вы кананьня вузлавых задач калгаснага будаўніцтва і бягучых гаспадарча-палітычных кампаній. Напрыклад, Скарадзінскі СПК (Ельскі раён), паставіўшы ў цэнтр сваёй увагі арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, забясьпечыў укараненьне вызьдзельчыны ва ўсе галіны працы калгасаў, дакладную пастаноўку ўліку працы, павышэньне адказнасьці за с.-г. інвэнтар і гэтым самым дабіўся значнага павышэньня прадукцыйнасьці працы ў калгасах. З посьпехам вырашаюцца задачы разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Калгасы, якія абслугоўваюцца сельпарткомам, ідуць перадавікамі па выкананьні пляну загатовак. Урэцкі сельпартком (Слуцкі раён) забясьпечыў сваёй работай поўнае выкананьне калгаснай пляну камплектаваньня сьвінога стада. СПК разгарнуў шырокую масавую работу па перавозе працы ў калгасах па рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Перадавы калгас імя Сталіна ўзяў на грамадзкі буксір бліжэйшыя калгасы, якія адстаюць у выкананьні сваіх асноўных задач. Добра праведзена ў калгасах растлумачальная работа ў сувязі з разьмеркаваньнем ураджаю. Урэцкі сельпартком своечасова выкрыў у калгасах дробна-буржуазныя кулацкія тэндэнцыі ў пытаньнях выкананьня абавязкаў перад дзяржавай па загатоўках. На барацьбу з гэтымі тэндэнцыямі мабілізаваны шырокія калгасныя масы. У калгасах праведзена разьмеркаваньне ўраджаю пад лёзунгам: «Хто больш працаваў, той больш і атрымлівае».

Парткіраўніцтва Магілеўскага раёну таксама адзначае значнае ажыўленьне ў рабоце калгасных парт'ячэек, якія абслугоўваюцца Вейнянскім і Вандзероўскім сельпарткомамі.

Такіх фактаў узорнай работы калгасаў, якія абслугоўваюцца сельпарткомамі, вельмі многа. Гэта ёсьць адлюстраваньне работы ячэек і партгруп, якія працуюць пад кіраўніцтвам сельпарткомаў і пры іх штодзённай дапамозе.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што ў рабоце сельпарткомаў ёсьць і рад вельмі значных недахопаў, прычым карэнныя гэтых недахопаў захоўваюцца ў значнай меры ў няправільным падыходзе паасобных райкомаў як да арганізацыі сельпарткомаў, так і да іх работы. Ня гледзячы на тое, што ў пачатковай стадыі арганізацыі сельпарткомаў на партнарадзе пры ЦК КП(б)Б даны былі выразныя ўстаноўкі арганізацыйнага парадку, выразна былі вызначаны задачы работы, усё-ж у радзе выпадкаў дапушчаны недакладнасьці. Паасобныя райкомы аднесьліся да арганізацыі СПК фармальна. Замест вызначэньня апорнымі пунктамі ячэек саўгасаў, МТС ці буйнейшых калгасаў, у некаторых выпадках вызначаліся парт'ячэйкі дробных, слабых калгасаў, а часамі проста апорным пунктам вызначалася сельсаветская парт'ячэйка, што зьяўляецца грубым парушэньнем палажэньня ЦК аб арганізацыі сельпарткомаў. Вызначэньне апорнымі пунктамі ячэек дробных калгасаў або сельсаветскіх парт'ячэек ні у якім разе ня можа апраўдаць тэй задачы, якая стаіцца стварэньнем сельпарткомаў.

Полацкі райком КП(б)Б толькі тым і абмежаваўся, што вылучыў і прызначыў сакратара сельпарткому, парушыўшы ўнутрыпартыйную дэмакратыю. Сельпартком пры саўгасе «Палата» створан не па вытворчым прынцыпе, у яго абслугоўваньне ўваходзілі і дзьве чыгуначныя парт'ячэйкі.

Найбольш агульным недахопам у рабоце многіх СПК зьяўляецца тое, што члены парткомаў не выкарыстоўваюцца для жывога кіраўніцтва работай прымацаваных ячэек. Гэту работу ва многіх выпадках нясуць на сабе выключна сакратары СПК. Работа-ж членаў парткомаў заключаецца пераважна ва ўдзеле на пасяджэньнях сельпарткомаў. Ёсьць выпадкі фармальнага падыходу да вырашэньня многіх прынцыповых пытаньняў. Бацьвінаўскі сельпартком (Крычаўскі раён) на адным пасяджэньні «абмеркаваў» 16 пытаньняў, г. зн. амаль увесь месячны плян работы. Пасьля гэтага пасяджэньня сакратар сельпарткому спакойна «апусьцеецца ў масы». Вядома, што такімі мэтадамі нельга дасягнуць належнай пастаноўкі партыйна-масавай работы ў калгасах.

Работа прымацаваных калгасных парт'ячэек да Навасёлкаўскага сельпарткому (Веткаўскі раён) ніколькі не палепшылася за час існаваньня сельпарткому. Там члены сельпарткому выконваюць абавязкі выключна па месцы сваёй непасрэднай работы, а сакратар СПК толькі і занят тым, што штодзённа сьцьліць у раённы цэнтр «за ўстаноўкамі», а ў калгасах яго амаль ніколі ня відаць. Гэты сакратар нават ня лічыць патрэбным зьяўляцца на перавыбарчыя сходы парт'ячэек, якія абслугоўваюцца сельпарткомам.

Сельпартком, які створан пры апорнай ячэйцы калгасу «Новы быт» (Талачынскі раён) зусім не працуе. Работа прымацаваных калгасных парт'ячэек (Крычынская і калгасу імя Мархлеўскага) не перабудавана ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі. Ячэйкі зусім слаба змагаюцца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, а сельпартком застаецца і па сёньняшнім дзень у ролі пасыўнага наглядальніка.

За час свайго існаваньня з 20 жніўня сельпартком правёў прыблізна 3-4 пасяджэньні, напісаў некалькі пастаноў і падшыў іх у папку. Канкрэтнай работы няма. Сакратар СПК Юркевіч адсежваўся ў кабінэце, «не соизволивши» ні разу зазірнуць ні ў адну з прымацаваных парт'ячэек. Талачынскі райком аслабіў сваю ўвагу да тых

УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС НІЗАВЫХ ГАЗЭТ

Рабселькоры, на барацьбу за арганізацыйна-гаспадрчае ўмацаваньне калгасаў

Глыбокай прапрацоўкай і рэалізацыяй пастаноў усебеларускага зьезду рабсельваенкораў, штодзенным партыйным кіраўніцтвам забясьпечым актыўны дзел у конкурсе ўсяго нізавога друку, усіх рабселькораў і шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў

Моцным партыйным кіраўніцтвам забясьпечым правядзеньне конкурсу

Работа нізавога калгаспа-саўгаснага друку Талачынскага раёну да гэтага часу была слаба разгорнута. Ня гледзячы на тое, што па раёне налічвалася каля 150 селькораў, ніякай масава-апэрацыйнай работы з імі не праводзілася. Каля 20-ці насьценных газэт па раёне, якія лічацца на вучоце, выходзілі ад выпадку да выпадку, перад вялікімі рэвалюцыйнымі сьвятамі. Пастановы 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў значнай часткай рэдкалегій насьценгазэт і рабселькораў па калгасах не прапрацаваны.

Прычына слабой работы нізавога друку і рабселькораў Талачынскага раёну хавалася ў тым, што партыйныя ячэйкі не ў належнай меры кіравалі гэтай работай, ня лічылі яе сваёй непасрэднай справай. Паасобныя работнікі сельсаветаў, калгасаў сваімі ўводзінамі проста падрывалі работу нізавога друку. Напрыклад, старшыня Мархлеўскага сельсавету, член КП(б)Б Рудніцкі, пра дрэнныя ўчынкі якога некалькі раз пісалася ў газэтах, на сходзе селькораў і калгасьнікаў у часе выбараў рэдкалегіі заявіў:

—На што нам такія насьценгазэты, якія падрываюць аўтарытэт нашых работнікаў (намёк на сябе.—Ю.Б.), яны ня прыносяць карысьці, а толькі шкоду, таму лепш зусім не выпускаць насьценгазэту.

Гэтаму, наскрозь апартуністычнаму, антыпартыйнаму выпаду Рудніцкага сход рабселькораў імя Мархлеўскага даў рашучы адпор, але гэты факт сам па сабе гаворыць аб тым, што з кіраўніцтвам і дапамогай ячэек і асобных партыйцаў і работнікаў насьценгазэтам па Талачынчыне ня ўсё ў парадку.

Зараз з уключэньнем раёну ў конкурс, абвешчаны «Правдой», у партыйным кіраўніцтве нізавым друкам і рабселькорамі намеціўся пералом. Райком КП(б)Б і райгазэта сталі на шлях карэннага паляпшэньня кіраўніцтва саўгасна-калгаснымі насьценгазэтамі і рабселькорамі.

Культпропам РК КП(б)Б сумесна з рэдакцыяй газэты «Калгасьнік Талачынчыны» праводзіцца рад практычных мерапрыемстваў па арганізацыі насьценных газэт у кожным саўгасе і калгасе, па мабілізацыі насьценгазэт і рабселькораў па барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на заканчэньне да 10-га сьнежня першапачатковай апрацоўкі ільну, на 100-процантнае выкананьне загатовак.

Райкомам партыі мабілізаваны 15 раёных работнікаў з партыйнага актыву для ўзмацненьня работы на разгортваньне конкурсу. З часу ўключэньня раёну ў конкурс на 20-га лістапада парт'ячэйкамі сумесна з прымаванымі раённымі работнікамі праведзена 6 куставых спэцыялізаваных зьлётаў рабселькораў калгасаў і саўгасаў. Гэтыя зьлёты ўжо даюць практычныя вынікі ў разгортваньні масава-апэрацыйнай работы нізавога друку і рабселькораў.

Пасьля кожнага зьлету зараз-жа ствараюцца ўдарныя брыгады селькораў-калгасьнікаў для ліквідацыі прарываў у апрацоўцы ільну, абмалоце збожжа, арганізацыі чырвоных абозаў. У Еўлахаўскім і Коханаўскім сельсаветах ужо арганізаваны чырвоныя абозы са збожжам і ільном. З першым чырвоным абозам арганізаваным 17 лістапада па ініцыятыве селькораў Еўлахаўскага сельсавету, адпраўлены 33 пуды ільнавалакна, 296 пуд. збожжа і 70 пудоў ільнасемя.

У дзень уключэньня ў конкурс селькоры польскага нацыянальнага калгасу імя Мархлеўскага арганізавалі вялікі чырвоны абоз ільну і збожжа, а таксама стварылі 3 ударныя брыгады калгасьнікаў па пераапрацоўцы ільну, паставіўшы сваёй задачай да ўстаноўленага ўрадам тэрміну (10 га сьнежня) поўнасьцю скончыць апрацоўку ільну і пянькі. Праз сваю насьценгазэту селькоры дабіліся пуску ў ход складанай ільнамялкі, якая да гэтага часу па віне праўленьня не скарыстоўвалася.

Па цэлым радзе калгасаў ужо наладжан рэгулярны выпуск штодзенных насьценгазэт «На штурм» на макетах, выпушчаных газэтай «Рабселькор».

Конкурс «Правды» па Талачынскім раёне разгортваецца. Там, дзе парт'ячэйкі забясьпечылі сапраўднае апэрацыйнае кіраўніцтва рабселькоры і насьценгазэты па справе становяцца баявымі памочнікамі парт'ячэек і справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, выкананьня імі поўнасьцю і ў тэрмін усіх відаў загатовак, сканчэньня першапачатковай апрацоўкі ільну і г. д.

Прыклад перадавых ячэек у рабоце з рабселькорамі павінен быць перанесены ўсімі ячэйкамі раёну. Толькі пры гэтай умове рабселькоры і нізавы калгасны друк Талачынчыны змогуць выйсьці і выйдуць у рады перадавікоў усесаюзнага конкурсу.

Б. Ю.

«РАБКОР — УДАРНІК І АРГАНІЗАТАР УДАРНІКАЎ СТАНОВІЦЦА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ РАБКОРАЎСКАГА РУХУ, ТАКСАМА ЯК І РАБОЧЫ-УДАРНІК СТАЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ. СЕЛЬКОР — КАЛГАСЬНІК, УДАРНІК І АРГАНІЗАТАР КАЛГАСНАГА РУХУ СТАНОВІЦЦА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ СЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ ТАМУ, ШТО МІЛЬЁНЫ КАЛГАСЬНІКАЎ СТАЛІ АСНОЎНАЙ І ГАЛОЎНАЙ АПОРАЙ САВЕЦКАЕ УЛАДЫ НА ВЕСЦЫ». (З пастановы Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху).

ПАДЗЕЛІМСЯ ВОПЫТАМ БАРАЦЬБЫ ЗА ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ

Калгас «Май», Шэйскага сельсавету (Крупскі раён), у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня мае ўжо шмат дасягненьняў. Усе работы ў калгасе перавезены на зьдельшчыну, дзякуючы чаму **пляны асеньняй сяўбы мы перавыканалі на 10 проц.** Уборачная кампанія праходзіла з вялікім уздымам творчай энэргіі калгасьнікаў — **усе культуры былі свалчасова і поўнасьцю ўбраны.**

У нашым калгасе ў гэтым годзе зас павана **сьвінагадоўчая фэрма**, будаўніцтва якой ідзе **ударнымі тэмпамі.** Паводле пляну мы павінны былі пабудаваць у бягучым годзе адзін сьвінарнік. Гэты сьвінарнік праз тыдзень будзе скончан. Плян будаўніцтва будзе выканан **датэрмінова.** Паводле пляну мы павінны да канца году паставіць **96 сьвінаматак.** Па сёньня мы ўжо маем 76, рэшта будуць даўкамплектаваны ў бліжэйшы час.

Пляны загатовак мы таксама перавыканалі. Нам трэба было здаць 15 тон бульбы, мы здалі 69 тон, з якіх 15 тон уключана ў эшалён пралетарам Ленінграду. Апрача гэтага 50 тон **бульбы забуртавана да вясны 1932 г. Калгас адвёз чырвоным абозам звыш пляну 2 тоны збожжа.** Іншыя культуры мы здаем дзяржаве згодна даных плянаў свалчасова і з перавыкананьнем.

Посьпехі нашага калгасу практычным паказам агітуюць аднаасобнікаў за калектыўную гаспадарку.

Гэтых дасягненьняў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу мы дабіліся ў рашучай барацьбе з кулацкім уплывам на паасобных калгасьнікаў.

Уключаючыся ва ўсесаюзны конкурс, мы мабілізуем усе свае сілы, усю сваю энэргію на зьнішчэньне нашых недахопаў.

15-га лістапада мы выпусьцілі 1-ы нумар штодзённі «На штурм», якую абяцаем штодзенна выпускаць на працягу ўсяго далейшага часу. У самы бліжэйшы час мы праводзім унутрыкалгасныя рэйды селькораў па пытаньнях праверкі якасьці работы фэрмы, пастаноўкі хаваньня прадуктаў на зіму і г. д. Мы абавязваемся правесьці сумесныя рэйды селькораў нашага калгасу і суседняга калгасу «Чырвоная Зьмена» па перадачы ім вопыту работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Мы заклікаем усіх рабселькораў і нізавы друк БССР праз цэнтральны і раённы друк дзяліцца лепшым вопытам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Старшыня рэдкалегіі—МІРОНАВА
Сельскораўскі актыў калгасаў: Казакевіч, Купрыянаў, Амбросаў, Пятрова, Сярмяшка, Г. Карпэка, Сярмяшка А., Кухарзика.

БССР, УССР і ПАЎНОЧНЫ КАЎКАЗ

УСТУПІЛІ У САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА на лепшае правядзеньне конкурсу

ТЭЛЕГРАМА.

ХАРКАЎ. КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)У.

КОПІІ РЭДАКТАРОМ ГАЗЭТЫ «КОМУНІСТ», ЧАСОПІСІ «РАБСЕЛЬКОР», ГАЗЭТЫ «РОДЯНСКЕ СЕЛО», КОПІЯ МАСКВА—«ПРАВДА».

ВЫКЛІКАЕМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЦЭНТРАЛЬНЫЯ І РАЕННЫЯ ГАЗЭТЫ УКРАІНЫ ПА ПЫТАНЬНІ ЗЬЕЗДУ Ў АБВЕШЧАНЫМ «ПРАВДОЙ» УСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ НІЗАВЫХ ГАЗЭТ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ, МТС НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ.

ПРОСІМ СКЛІКАЦЬ У ХАРКАВЕ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ НАРАДУ ДЛЯ АБГАВАРЭНЬНЯ ПЫТАНЬНЯ САЦСПАБОРНІЦТВА, ПАВЕДАМЕЦЕ ТЭРМІН, ВЫШЛЕМ ДЭЛЕГАЦЫЮ.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.
РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».
РЭДАКЦЫЯ «РАБСЕЛЬКОРА».
РЭДАКЦЫЯ «КАЛГАСЬНІКА БЕЛАРУСІ».

ТЭЛЕГРАМА.

МЕНСК, КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

КОПІІ РЭДАКТАРОМ ГАЗЭТ «ЗЬВЯЗДА», «РАБСЕЛЬКОР», «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ», КОПІЯ МАСКВА—«ПРАВДА».

ВАШ ВЫКЛІК НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРЫМАЕМ ВЫКЛІКАЕМ НА СПАБОРНІЦТВА НАЎНОЧНЫ КАЎКАЗ. ПРЫЯЖДЖАЙЦЕ 3-ГА СЬНЕЖНЯ. ПРОСІМ УКЛЮЧЫЦЬ У ДЭЛЕГАЦЫЮ ДВУХ РЭДАКТАРОЎ — АДНАГО АД РАЕННАЙ І АДНАГО АД ФАБРЫЧНА - ЗАВОДСКАЙ ШМАТТЫРАЖКІ.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)У ДУБРОВІН.
РЭДАКЦЫЯ «КОМУНІСТ» ТАРАН.
РЭДАКЦЫЯ «РОДЯНСКЕ СЕЛО» ЛАКІЗА.
РЭДАКЦЫЯ «РАБСЕЛЬКОР» СІНЯВА.

ХВАЛЯЮ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ...

Адна за аднай уключаюцца ва ўсесаюзны конкурс калгасныя і саўгасныя газэты Аршаншчыны.

Селькоры калгасу «Ларыкаўка», сабраўшыся на сход па пытаньнях уключэньня ў конкурс, запатрабавалі ад праўленьня калгасу зрабіць справаздачу аб тым, чаму да гэтага часу не адгружана рабочым гораду палкам уся бульба і капуста, якая вызначана для продажу згодна загатоўчага пляну. Тут-жа высьветлілася, што справа тармазілася, галоўным чынам, наўменьшем і апартуністычным нежаданьнем праўленьня па-бальшавіцку арганізаваць загатоўкі. Селькораўскі зьлёт калгасаў, на якім прысутнічаў увесь калгасны актыў, абвясьціў ударную пяцідзённую па выкананьні ўсіх відаў загатовак. Зараз-жа была арганізавана селькораўская брыгада для ўдарнай пагрузкі бульбы.

Селькоры паставілі сваёй задачай па працяку пяцідзённі кожны дзень арганізоўваць чырвоныя абозы гародніны (бульбы, капусты) рабочым гораду.

Пастанова селькораўскага зьлёту на заўтра-ж ператварылася ў жыцьцё.

Насьценгазэта «На штурм», якая пачала выходзіць у калгасе штодзенна, у дні УДАРНАЙ ПЯЦІДНЕЎКІ выходзіла ў трох экземплярах. Пра па станову селькораўскага зьлёту ўвечары ўжо ведаў кожны калгасьнік. У першы дзень ударнай пяцідзённі селькораўскім абозам імя газэты «На штурм» адпраўлена 100 цэнтнэраў бульбы і каля 40 цэнт. капусты.

На заўтра работа ня спынілася. Вышаўшы наступны нумар насьценгазэты «На штурм» заклікае: «Павысіць тэмпы загатовак. Штодня адпраўляць ня менш 20 падвод бульбы і 5 падвод капусты». Шляхам мабілізацыі ўсіх коняй калгасу (ЗЯБЛІВА КАЛГАСА ЗАКОНЧАНА) і прыцягненьня пра выклік у штодзенках транспарту рабочага кааператыву за першыя дні пяцідзённі (16 і 17 лістапада) плян загатовак выкаман на 70 проц. Тэмпы адгрузкі бульбы штодня ўзрастаюць.

Трэба адзначыць вялікую актыўнасьць селькораў калгасу і ў пытаньнях наладжаньня догляду жывёлы, барацьбы за акуратны прыход на работу, свалчасовай і нармальнай выдачы кармоў і г. д.

У калгасе ёсьць малочная фэрма з 300 штук жывёлы. Работа скотнікаў і даярак была пастаўлена дрэнна. Зьлёт селькораў, дзе прысутнічаў амаль увесь абслугоўваючы персанал аборы, дэтальна абгаварыў прычыны дрэннай работы скотнага двара. Селькоры паставілі перад праўленьнем пытаньне аб перакідцы на работу ў скотны двор лепшых калгасьнікаў, удзельні ў іх рабоце сапраўдных зьдельшчыны, дамагаючыся прэміраваньня скотнікаў і даярак-ударнікаў.

Агульна - калгасная штодзенка таксама магчымасьці ахапіць цэлы рад пытаньняў работы скотнага двара. Таму селькоры, якія працуюць на скотным дворе, далі наказ рэдкалегіі калгаснай штодзенкі выпускаць у аборы адзін раз у тыдзень насьценгазэту «За сацыялістычную жывёлагадоўлю», якая спэцыяльна зьясьняць работу скотнікаў, жывёлаводаў і даярак.

Першы нумар гэтай газэты ўжо выйшаў 18 лістапада. Па яе ініцыятыве ўжо арганізавалася ўдарная брыгада даярак і скотнікаў, якія ўзялі на сябе абавязкі палепшыць догляд кароў. Брыгада завяслила сябе селькораўскай і ўжо вапісала два допісы ў сваю насьценгазэту.

Гэтыя дасягненьні трэба павялічыць далейшым разгортваньнем мерапрыемстваў па ўдзеле ў конкурсе.

Брыгада газэт «Зьвязда» і «Рабселькор»: Ю. Бялько, Мурашка.

Восем штодзенных апэрацыйных бюлетэняў рабіных газэт прысьвечаных барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў і выкананьне пляну загатовак пачалі выходзіць у часе конкурсу.

Конкурс адзначаем канкрэтнымі дасягненьнямі

Насьценныя газэты калгасаў і саўгасаў Еўлахаўскага і Коханаўскага сельсаветаў (Талачынскага раёну) уключыліся ў правядзеньне конкурсу на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

13-га лістапада адбыліся зьлёты рабселькораў, юнкораў і рэдкалегій насьценных газэт гэтых сельсаветаў, на якіх былі абгавораны пытаньні канкрэтнай работы насьценгазэт і рабселькораў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

У Еўлахаўскім сельсавеце рабселькоры на зьлёце ўзялі на сябе абавязкі да 20-га лістапада дабіцца заканчэньня выкананьня пляну загатовак па сельсавеце і зрабіць рашучы пералом у бліжэйшыя дні па выкананьні мабілізацыі сродкаў.

Рабселькоры абавязаліся арганізаваць добраякасную брыгадную апрацоўку ільну і пянькі па ўсіх калгасах сельсавету з таксі разьлікам, каб да тэрміну выкаваць пляны ільназагатовак.

Рэдкалегія насьценгазэты і рабселькоры саўгасу «Ройцы» ўзялі пад свой нагляд бліжэйшыя два калгасы і наладзілі ў іх работу насьценгазэт, порадаючы вопыт работы сваёй насьценгазэты, адпачасова дапамагалі ў рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні гэтых калгасаў. Па зьлёце рабселькоры выклікалі на сацспаборніцтва Слаўінскі сельсавет на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Па ініцыятыве рабселькораў па Еўлахаўскім і Коханаўскім сельсаветах былі арганізаваны ў адзнаку конкурсу «Правды» ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ СА ЗБОЖЖАМ І ІЛЬНАВАЛАКНОМ. Праводзіцца рад іншых мерапрыемстваў.

Так узятыя на сябе абавязкі рабселькоры ажыцьцяўляюць у сваёй практычнай рабоце.

Брыгада «Зьвязды» і «Рабселькора»: ТКАЧОЎ, КРЫВІЦКІ.

Л. ЧАРНЯКОЎ

ЗАМАЦУЕМ ПЕРШЫЯ ПОСЬПЕХІ!

Пастановы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ўсесаюзнай нарады аб перабудове рабселькораўскага руху мелі рашаючае значэньне ў разгортваньні нізавога друку і рабселькораўскага руху і ўзацненьні партыйнага кіраўніцтва ім у БССР. Ужо ў порыд падрыхтоўкі да другога ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, кіруючыся дырэктывамі ЦК УсеКП(б), КП(б)Б, над кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, разгарнула вялізарную работу па практычнай перабудове рабселькораўскага руху.

Падрыхтоўка і самае правядзеньне зьезду зьявілася практычным ператварэньнем у жыцьцё пастаноў ЦК аб перабудове рабселькораўскага руху і дэмакратызаваным партыйным кіраўніцтве ім.

Шырокая масавая кампанія па прапрацоўцы пастаноў зьезду, праведзеная па ўсёй БССР, спрыяла значэ большаму замацаваньню гэтых першых посьпехаў, ужо адзначаных ЦО нашай партыі—«Правдой».

Абвешчаны «Правдой» конкурс нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў зьявіўся тым стрыжнявым зьвяном, ухапіўшыся за якое КП(б)Б будзе дабівацца і даб'ецца новых рашаючых посьпехаў у справе перабудовы рабселькораўскага руху, у справе барацьбы за цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва, пастаўленую партыяй,—за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Пасьля абвяшчэньня «Правдой» конкурсу **культпроп ЦК КП(б)Б, ЦО КП(б)Б—«Зьвязда» і ўсебеларуская рабселькораўская газэта—«Рабселькор»** неадкладна ў яго ўключыліся і правялі рад першых практычных мерапрыемстваў:

12 рабстнікаў цэнтральных газэт **мабілізаваны** па ўвесь лістапад для павышэньня работы раённых газэт па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і ўмацненьні барацьбы за выкананьне пляну загатовак; **5 раённых газэт** перавезены на адзін месяц на штодзённае выданьне; **7 раённых газэт** выдаюць штодзенныя бюлетэні; газэтай «Рабселькор» выдана 11.000 экземпляраў спэцыяльнага дадатку з умовамі конкурсу і іншым інструкцыйным матар'ялам; «Рабселькор» таксама выдаў і разаслаў калгасам і саўгасам **50.000 спэцыяльных макетаў-штодзенак «На штурм за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за выкананьне пляну загатовак».**

Пасьля зьмяшчэньня «Зьвяздой» на сваіх старонках установачнага матар'ялу газэта «Рабселькор» разгарнула шырокую масава-апэрацыйную работу па ўключэньні ў конкурс нізавых саўгасна-калгасных і фабрычна-заводзкіх газэт. Яе работнікі зрабілі **чатыры выезды ў 9 раёнаў.** Апрача макетаў штодзенных газэт **«На штурм»** газэта **«Рабселькор»** выдала яшчэ **15.000 спэцыяльных макетаў** трохдзённых газэт **«За сацыялістычную сьвінагадоўлю».** У бліжэйшыя дні сумесна з адпаведнымі цэнтральнымі газэтамі дадаткова відаюцца **спэцыялізаваныя макеты па ільне, жывёлагадоўлі, транспарце і кааперацыі.**

Праведзены **Менскім гаркомам КП(б)Б** разам з газэтай **«Рабселькор»** агульна-гарадзкі **зьлёт рабкораў Менску,** прыняў спэцыяльную пастанову аб **уключэньні ў конкурс і выклікаў на сацспаборніцтва** па дапамозе нізавому друку падшэфных калгасаў **рабкораў і нізавы фабрычна-заводзкі друк Гомелю, Віцебску і Магілеву.**

Культпроп ЦК КП(б)Б у парадку апэрацыйнай праверкі выкананьня дырэктыў ЦК аб уключэньні ў конкурс правёў шырокую нараду работнікаў цэнтральных газэт і рэдактароў шматтыражак гор. Менску. Нарада выкрыла моцныя і слабыя бакі работы цэнтральных газэт ў справе разгортваньня конкурсу.

Значную апэрацыйна-масавую работу разгарнула газэта «Рабочий», якая асноўную ўвагу аддала пытаньням **прыцягненьня нізавога фабрычна-заводзкага друку на дапамогу нізавому друку сваіх падшэфных калгасаў**—па разгортваньні конкурсу. Для гэтага яна правяла **нарады рэдактароў шматтыражак Менску і дапамагла ім арганізаваць і накіраваць у падшэфныя калгасы спэцыяльныя брыгады друку.** Такіх брыгад толькі па Менску выехала ўжо 7. Першыя весткі ад гэтых брыгад яшчэ больш пераконваюць аб тым вялізарным значэньні, якое яны будуць мець у разгортваньні конкурсу.

З правядзеньнем конкурсу зьвязала барацьбу за «Чырвоную кнігу савецтаў» і цэнтральная газэта «Савецкая Беларусь».

Значную апэрацыйную работу разгортвае цэнтральная газэта на польскай мове «Орка». Яна выдала спэцыяльнай укладкай умовы конкурсу, надрукавала макеты насьценкі, правяла зьлёт рабселькораў нацыянальных польскіх сельсаветаў Койданаўшчыны, арганізавала рад выездаў.

Энэргічна ўключылася ў конкурс нізавых газэт рэспубліканская сялянская газэта БССР «Калгасьнік Беларусі».

Гэта нарада пры ЦК паказала, што яшчэ ня ўсе цэнтральныя газэты ў выстарчальнай ступені ўсьвядомілі тое вялізарнае значэньне, якое ў барацьбе за асноўныя палітыка-гаспадарчыя задачы набывае конкурс. А што конкурс мае іменна такое значэньне—гаворыць тая вялізарная ўвага, якую аддаюць яму партыйныя арганізацыі па месцах.

Менскі гарком КП(б)Б, напрыклад, абмеркаваўшы пытаньне аб конкурсе, намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў. Праведзен агульнагарадзкі зьлёт рабкораў. 1 сьнежня будзе праведзена спэцыяльная нарада рэдкалегій нізавых газэт і рабкораў па апэрацыйнай сыстэме аб уключэньні іх у конкурс.

Абмеркавалі пытаньне аб конкурсе і намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў і рад другіх райкомаў КП(б)Б **(Быхаўскі, Касьцюковіцкі, Аршанскі, Бабруйскі, Мазырскі, Слуцкі і інш.)**

Аршанскі райком разам з раённай газэтай «Ленінскі прызыў» праводзіць спэцыялізаваныя зьлёты рабселькораў. **Сенненскі** райком праводзіць культпрапараду ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ раёну, на якой будуць распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па конкурсе, адначасова праводзяцца тры спэцыялізаваныя зьлёты рабселькораў. Плешчаніцкі райком правёў па пытаньнях конкурсу спэцыяльную нараду сакратароў ячэек і рэдкалегій. Касьцюковіцкі райком мабілізаваў у распараджэньне рэдакцыі раённай газэты для разгортваньня конкурсу **8 чалавек** партыйнага актыву **раёну.** Такая-ж мабілізацыя ў распараджэньні раённых газэт для разгортваньня работы па ўключэньні ў конкурс праведзена і Бабруйскім райкомам КП(б)Б (мабілізавана 10 чал.), Талачынскім (4 чалавекі), Клімавіцкім (5 чал.) і г. д.

У паасобных раёнах спэцыяльнымі пастановамі райкомаў ствараюцца фонды для прэміраваньня за лепшыя гаспадарчыя паказальнікі рэзультатаў правядзеньня конкурсу.

Вялізарнае палітычнае значэньне, якое падаюць конкурсу партыйныя арганізацыі, вельмі выразна выяўляецца ў наступнай пастанове, вынесенай бюро **Слуцкага РК КП(б)Б** па пытаньні ўключэньня ў конкурс:

«Бюро РК падкрэсьлівае, што справа правядзеньня конкурсу нізавых газэт на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—ёсьць справа ўсёй партарганізацыі і кожнай парт'ячэйкі ў паасобку, на ўключэньне ў які павінна мабілізавацца ўся партарганізацыя і над яе кіраўніцтвам уся пралетарская грамадзкасьць».

Ня менш вялікую работу разгарнула таксама і значная частка раённых газэт, якія шырокай масава-апэрацыйнай работай уключыліся ў конкурс.

Пры непасрэднай актыўнай дапамозе і ўдзеле раённых газэт **расьце сотна штодзенак.** Так, у Стара-Дароскім раёне пачаўся ўжо выхад **8 новых штодзенных газэт.** У Плешчаніцкім раёне выходзіць **25 штодзенак.** У Чырвона-Слабодзкім раёне ў 10 СТФ і 4 МТФ пачалі выходзіць трохдзённыя газэты «За сацыялістычную жывёлагадоўлю» па макетах, выданых рэдакцыяй газэты «Рабселькор».

Паасобныя газэты праяўляюць **творчую ініцыятыву,** арганізоўваючы новыя апэрацыйныя мерапрыемствы ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за выкананьне пляну загатовак. Так, Барысаўская раённая газэта **«Бальшавік Барысаўшчыны»** абвясьціла **збожжавую эстафету** на лепшае выкананьне пляну загатовак.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што значэньне конкурсу, як важнейшага палітычнага мерапрыемства ў барацьбе за асноўныя гаспадарча-палітычныя задачы партыі ў калгасным будаўніцтве, узьнята ўсёй КП(б)Б, яе масовымі партыйнымі арганізацыямі і ўсім камуністычным пралетарскім друкам БССР на прынцыповую палітычную вышыню, аб тым высокім палітычным узроўні, на якім і будзе праводзіцца ўвесь конкурс. Гэта пакладзе яшчэ большую адказнасьць на кожную партарганізацыю і ячэйку, на кожную паасобную газэту, ад цэнтральнай да раённай і нізавой, за пасьпяховае правядзеньне конкурсу, за недапушчэньне ніякіх скажэньняў. Самы рашучы адпор трэба даць найменшай спробе ператварыць конкурс са сродку барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — у самамэту.

Нельга таму не адзначыць **няправільных тэндэнцый райкому і раённай газэты Мазыра,** дапусьціўшых у пекаторай ступені скажэньне конкурсу, як масавага палітычнага мерапрыемства, мабілізуючага на выкананьне асноўных задач партыі ў калгасным будаўніцтве, па паскарэньне перабудовы рабселькораўскага руху, ператвараючы яго толькі ў «агляд работы нізавога друку».

Такая пастаноўка пытаньня цяпер будзе нягравільнай таму, што на даным этапе разгортваньня конкурсу патрэбна вялікая разгорнутая масава-апэрацыйная работа ўсяго нізавога друку, а ня толькі агляд яго. Але такія скажэньні, паўтараем, адзіночныя і не яны вызначаюць тую значную работу па правядзеньні конкурсу, якую ўжо разгарнулі партарганізацыі і газэты БССР. Лепшым пацьвярджэньнем гэтага зьяўляецца вялізарная творчая работа, якая разгарнулася вакол конкурсу непасрэдна ў калгасах і саўгасах БССР. Дзесяткі лістоў брыгад друку, дзесяткі рапартоў, шматлікія карэспандэнцыі дзесяткам цэнтральных і раённых газэт БССР—гэта **найбагацейшы вопыт штодзённай напружанай работы нізавых калгасна-саўгасных газэт па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.**

Насьценная газэта «Калгасьнік» калгасу «Чырвоны бераг», (Аршанскі раён) зьявілася арганізатарам спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасе. Газэта расставіла апэрацыйныя пасты на скотным дворе. Гэтыя пасты праз што дзённу паведамілі:

«Сёньня ударная брыгада даярак не спазьнілася і была акуратнай».

«Брыгада на кармарэзцы пасправілася з работай. Тады брыгада скотнікаў выклікала яе на сацспаборніцтва. У рэзультаце абедзьве брыгады выканалі свае заданьні».

Гэта баявая газэта правяла высокую палітычную сьвядомасьць. Яна не абмежавалася толькі сваімі мясцовымі справамі. Яна ўзяла на буксір газэты двух суседніх, адстаючых у загатоўках, калгасаў і дабілася арганізацыі там чырвонага абозу са збожжам. Яна дапамагла гэтым калгасам прыступіць да выданьня штодзенкі «На штурм».

У калгасе імя Мархлеўскага (Талачынскі раён) газэта «На штурм за лён» разгарнула вялікую работу. Яна выдаецца ў некалькіх экземплярах, адзін з іх вывешваецца на ільнамяльным пункце. Пасьля першых некалькіх нумароў газэты і выкананьня калгасам сваіх пляноў паступіў пералом. На пункце стварыліся дзве ўдарныя брыгады ільнатрапальшчыц. Гэтыя брыгады праз газэту ўнесьлі прапанову аб пераходзе на дзьвёхзьменную работу з 12 гадз. ночы да 9 гадз. раніцы для выкананьня пляну.

У той час, як калгас не спраўляўся з апрацоўкай ільну, у яго стояла без выкарыстаньня 9-парвальная ільмялка. Газэта выступіла супроць анартуністычнага нявер'я паасобных членаў праўленьня і дабілася рамонту ільнамялкі.

Так маленькая газэта па-баявому змагаецца за мэханізацыю, за выкарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў для выкананьня сваіх пляновых заданьняў.

Асобна неабходна адзначыць гераічную барацьбу штодзенкі «За бальшавіцкія тэмпы» калгасу «Случ» (Слуцкі раён), якая ўжо выдала **100 нумароў сваёй газэты. Аб не вялікай і важнай рабоце, аб не барацьбе за пляны, аб не вопыце апэрацыйна-масавай работы можна шмат расказаць.** Яна змагаецца за ўкамплектаваньне стада сьвіней. Яе селькоры асабістым прыкладам дабіліся ўкамплектаваньня стада калгасу з унутраных рэсурсаў калгасьнікаў. Яна змагалася за размеркаваньне даходаў і ўраджаю, за ўдзельнае выдзяленьні, за ўлік работы па працадзёх. На канкрэтных фактах яна выхоўвала калгасьнікаў, яна сязьлівесна выкрывала і высьмейвала на паказ прагульшчыкаў і гультаёў, яна заахвочвала і заводзіла на чырвоную дошку лепшых калгасьнікаў-ударнікаў. Яна дабілася выкананьня пляну ўборкі бульбы, яна дапамагла поўнасьцю выканаць плян зяблева. У рэзультаце такой работы ў яе вырасла колькасьць селькораў-ударнікаў.

Так, пад лёзунгам ЦО партыі —«Правды», пад непасрэдным кіраўніцтвам мясцовых партыйных ячэек нізавы друк саўгасаў і калгасаў БССР і іх рабселькоры практычна ажыцьцяўляюць перабудову рабселькораўскага руху, змагаюцца за генэральную лінію партыі, за пляны, за тэмпы.

Конкурс, абвешчаны «Правдой», уключае ў сябе ўсё больш значнае калі пралетарскай грамадзкасьці. Гэта прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый выносяць пастановы аб уключэньні ў конкурс і бяруць на сябе сацзабавязацельствы.

Характэрнай у гэтым сэнсе зьявляецца пастанова раённай канферэнцыі настаўніцтва Быхаўшчыны, якая, спэцыяльна заслухаўшы пытаньне аб конкурсе, вынесла рад практычных пастаноў аб дапамозе і выпуску насьценгазэт, аб арганізацыі іх у калгасах і сельсаветах, дзе насьценгазэт яшчэ няма, аб уключэньні ў конкурс вучняў пінэраў і г. д.

Асабліва важнае значэньне набывае спэцыяльная пастанова ЦСПСБ аб уключэньні ўсіх прафарганізацый у конкурс і задачах нізавых газэт і фабзавкарганізацый у справе дапамогі падшэфным калгасам па правядзеньні конкурсу.

Такова першыя посьпехі ўдзелу нізавога друку БССР у конкурсе.

Наносячы рэшпучы ўдар па правым анартуністыцкім, як галоўнай небяспецы на дадзным этапе, па «левых» загібах і прымірэнцтве да іх, нізавы друк, пад кіраўніцтвам сваіх партарганізацый, дабіваецца яшчэ большых пос

ВАЕННЫЯ СПЭКУЛЯНТЫ НАЖЫВАЮЦЦА

6 ТЫСЯЧ ТОН НІТРАГЛІЦЭРЫНУ—У ЯПОНІЮ

АКУПАНТЫ ШЛЮЦЬ У МАНЧЖУРЫЮ НОВЫЯ ВОЙСКІ, БРОНЯЦЯГНІКІ, БАМБАВОЗЫ

Наступленьне японцаў на Дахушань

БЭЙПІН, 28. На станцыі Яопна па Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы адбыліся жорсткія сутычкі паміж японскімі і кітайскімі часьцямі. Як паведамляюць, японская армія пабліжаецца да **Дахушань** (на перасячэньні з Бэйпін-Мукдэнскай чыгункай па Дахушань-Тунляоскай чыгунцы).

Англія пратэстуе

ШАНХАЙ, 28. Як паведамляюць, англійскія ўлады паслалі японскім ваенным уладам у Мукдэне рэзкі пратэст супроць дзеяньняў, якія прывялі фактычна да захопу Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі і да спыненьня рэгулярнага руху ў выніку перавозкі японскіх войск.

Пасылка новых вайсковых часьцей

ШАНХАЙ, 28. Паводле паведамленьня агенцтва **«Гомінь»** японскія войскі ў колькасьці 3.000 з Фушуня і 2.000 з Чаньчжуня прасоўваюцца да Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. У Мукдэн пры была з Карэі авіяцыйная эскадрыльля і новая кавалерыйская брыгада.

***

ТОКІО, 28. Рада міністраў сёньня пастанавіла адправіць тэрміновым парадкам яшчэ 500 салдатаў у **Цзяньцзінь** са складу Квантунскай армії. У Цзяньцзіне, паводле японскіх крыніц, працягваецца перастрэлка. Мужчынскае насельніцтва японскай канцэсіі мабілізавана для ўдзелу ў ваенных дзеяньнях.

Чаго варты заявы японскай дыпляматыі

ПАРЫЖ, 28. Адзіны атрыманы да гэтага часу радай Ліґі нацый даклад ангельскага ваеннага аташэ ў **Бэйпіне**, руйнуе японскую версію аб вялізарнай канцэнтрацыі кітайскіх войск у раёне Цзіньчжоу. У дакладзе ўказваецца, што колькасьць кітайскіх войск, якія знаходзяцца ў гэтым раёне, складае ўсяго 23.000 чалавек і ніякай далейшай іх канцэнтрацыі **не наглядаецца.**

Нанкін згодзен на ўстанаўленьне нэйтральнай зоны

ШАНХАЙ, 28. Нанкін афіцыяльна заявіў аб сваёй згодзе на рашэньне рады Ліґі нацый адносна ўстанаўленьня нэйтральнай зоны ў Цзіньчжоу.

СУПРОЦЬ НОВАЙ СУСЬВЕТНАЙ БОЙНІ

У абарону СССР і кітайскіх саветаў

У сувязі з акупацыяй Манчжурыі Японіяй, а таксама пагрозай справакаваньня вайны з СССР, у «Новом мире» — рускім органе камуністычнай партыі НАЗШ — зьмешчана адозва кампартыі Амэрыкі наступнага зьместу:

Рабочыя! Падаюць снарады, трашчаць кулямёты, кінуць і шырыцца бой у Манчжурыі.

Акупацыя Манчжурыі — гэта падрыхтоўка новай сусьветнай вайны. Гляньце: японскія войскі ўрываюцца ў Кітай, баі пашыраюцца ня толькі на поўнач, у напрамку **да савецкіх межаў**, але і на поўдзень. Знарады падаюць у Цзяньцзіне. Японскі імпэрыялізм імкнецца справакаваць вайну ня толькі супроць Кітаю з мэтай захвату вялізарнай тэрыторыі **і задушэньня савецкага Кітаю, але таксама і супроць Савецкага Саюзу.**

Рабочыя! Чаму амэрыканскія войскі ў Кітаі? Чаму яны цяпер на справе падтрымліваюць японскае ўварваньне ў Кітай? Ці ня з прычыны **сакрэтнай згоды паміж Вашынгтонам, Токіё і Парыжам?** Гляньце: японская армія ў Манчжурыі вярбуе рускіх манархістаў, сьмяротных ворагаў Савецкай Расіі. Для чаго?—Для таго, каб заяваць супроць СССР і, як адкрыта гаворыцца—**«на савецкай зямлі».** Карэспандэнт н'ю-ёркскага «Таймса», Халят Абэнд паведамляе з Харбіну, што рускія манархісты спадзяюцца далучыцца да японцаў, **«захваціць» Уладывасток і ўсю Сібір на захад да возера Байкалу.**

Гэтыя рускія манархісты ў Манчжурыі «мяркуюць, што калі Японія і Расія пачнуць паміж сабою вайну, дык **Польшча і Румынія, пры падтрыманьні Францыі, змогуць атакаваць савецкую граніцу з захаду».**

Гэта і ёсьць той плян вайны супроць Савецкага Саюзу, аб якім у першых числах лістапада расказваў дэпутат кангрэсу Сіровіч у Н'ю-Ёрку.

Рабочыя Злучаных Штатаў! Што робіць урад у Вашынгтоне? Ён ідзе сам і вас штурхае на вайну. Ці-ж ня Гувэр і Стымсон дагаварыліся сакрэтна з Японіяй, каб апошняя справакавала вайну супроць Савецкага Саюзу? Чым-жа іншым могуць яны вытлумачыць згоду Стымсона па японскі захват Манчжурыі? Японія цяпер пашырае свой захват. Яна пасылае знарады ў сэрца Кітаю. Амэрыканскія войскі там. Для чаго? Ці не для таго, каб перашкодзіць японскаму імпэрыялізму — суперніку амэрыканскага імпэрыялізму ў аграбленьні Кітаю — захваціць больш таго, чым было дагаворана? Гэта таксама зьяўляецца новай небясьпекай вайны, вайны паміж Японіяй і Амэрыкай **за падзел Кітаю, за ўладаньне Філіпінамі.**

Рабочыя! Толькі ваша дзейнасьць можа папярэдзіць вайну. Ваенныя спэкулянты атрымліваюць **барышы ад праліцьця вашай крыві. Чаму Амэрыка адправіла 6.000 тон нітраглісцэрыну Японіі?** Для чаго, калі не для вайны?

Рабочыя, ці не знамянальна тое, што ў Цзяньцзіне, які цяпер зьяўляецца арэнаю жорсткіх баёў, **амэрыканскія войскі «стаяць напагатове».**

«Акцыі падняліся ад 1 да 5 фунтаў пры чутках аб вайне» — гавораць газэтныя загалоўкі ў Н'ю-Ёрку.

Рабочыя Амэрыкі! **Біце трывогу!** У вашых майстэрнях, у вашых рабочых арганізацыях рознага роду прымайце **рэзалюцыі пратэсту супроць вайны. Прымайце рэзалюцыі аб стварэньні аб'яднаных камітэтаў усіх рабочых супроць вайны.** Пратэстуйце супроць імпэрыялістычнага аграбленьня Кітаю і вайны супроць кітайскіх Саветаў. Пастаўляйце абаронаць Савецкі Саюз!

Няхай гураган масавых дэманстрацый пранясецца па краіне. Наносьце ўдар цяпер, пакуль ня позна, супроць новай сусьветнай вайны, супроць капіталістычных катаў усяго чалавецтва!

ФРАНКА-ЯПОНСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

МАЕ НА МЭЦЕ ПАДРЫХТАВАЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫЮ СУПРОЦЬ КІТАЙСКІХ САВЕТАЎ

10-ТЫСЯЧНАЯ ФРАНЦУСКАЯ АРМІЯ Ў КІТАЕ

ПАРЫЖ, 27. Учора камуністычны дэпутат тав. Дорыё выступіў у палаце дэпутатаў з запытаньнем аб «пазыцыі Ліґі нацый у Манчжурскім канфлікце і аб пагрозе, накіраванай супроць СССР».

Ліга нацый — арганізатар падзелу Кітая

Тав. Дорыё зазначыў, што Манчжурскі канфлікт павялічвае небясьпеку вайны на ўсім сьвеце і здольны адыграць ролю Мараканскага канфлікту, або балканскіх войнаў папярэдзіці 1914 г. Тав. Дорыё гаворыць, што Ліга нацый ня толькі нічога не зрабіла супроць зачынчыка вайны — Японіі, але наадварот, тры месяцы доўгіх дэбатаў выявілі **паўнейшае супрацоўніцтва Ліґі нацый з японскім імпэрыялізмам.** Ліга ня можа заняць такой пазыцыі, ня можа патрабаваць ад Японіі эвакуяваць кітайскую тэрыторыю, бо сама Ліга нацый зьяўляецца лігай імпэрыялістаў, якая раздае калёніяльныя мандаты.

Ці не зьяўляецца абсьледваньне Кітаю пачаткам канчатковага падзелу яго, якога дамагаюцца калёнізатары ўсіх краін? Бо інакш навошта пасылаць камісію і ў прыватнасьці навошта рабіць абсьледваньне ўсяго Кітаю? Мы патрабуем, каб Японія ачысьціла кітайскую тэрыторыю і пратэстуем супроць абсьледваньняў Ліґі нацый.

10 тысяч французкіх салдат у Кітаі

Далей, тав. Дорыё ставіць пытаньне: якая роля ў гэтай справе французкага ўраду? Тав. Дорыё зазначае, што за адсутнасьцю афіцыяльных заяў Францыі наконт гэтага, аб гэтым можна меркаваць па пазыцыі французкай прэсы, асабліва тай яе часткі, якая падтрымлівае ўрад і голасна заяўляе тое, аб чым напаўна гавораць у міністэрстве замежных спраў, а іменна — **інтарэсы абедзьвюх дзяржаў — Францыі і Японіі не разыходзяцца паміж сабою і што Японія ў пэўнай меры абараняе французкія інтарэсы. Францыя трымае 10.000 салдат у Кітаі, кае ў ім свае канцэсіі, сфэры ўплыву, чыгункі ў Хунані, таксама як Японія ў Манчжурыі.** Такім чынам ці можна ад вас чакаць, што вы патрабуеце ад Японіі пакінуць Манчжурыю, калі вы самі ў 1929 г. выступалі ўзброенай сілай супроць кітайскіх Саветаў?

Тав. Дорыё гаворыць, што капіталісты чакаюць вайны ў Манчжурыі, як сродку для выратаваньня ад сусьветнага эканамічнага крызісу.

Мэта камісіі Ліґі — падрыхтаваць інтэрвэнцыю супроць кітайскіх Саветаў

«Але адзін факт, — гаворыць далей тав. Дорыё, — напуе ва ўсёй пазыцыі Францыі ў радзе Ліґі нацый, гэта страшэнная пянавісьць французскіх імпэрыялістаў да ідэі Саветаў. Ужо 15 год Кітай пакутуе ад унутраных войнаў, якія распальваюцца імпэрыялізмам. Кітайскія генэралы аказаліся нездольнымі аб'яднаць краіну. Рэвалюцыйны вопыт 1927 г. паказаў масам, што не пры дапамозе здраднікаў з гаміндапу, **а толькі сваімі ўласнымі сіламі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі можна вызваліць краіну.** Ужо цяпер 80 млн. кітайцаў аб'яднана пад уладаю кітайскіх савецкіх урадаў, і калі-б не дапамога імпэрыялістаў кітайскай контр-рэвалюцыі, дык савецкая ўлада пашырылася-б на ўвесь Кітай. **Саветы — адзіная сіла, якая здольна ўстанавіць парадак і ліквідаваць фэадалізм і пры дапамозе падзелу зямлі, вырашыць аграрную праблему.**

Саветы бязупынна разьвіваюцца ў Кітаі, ня гледзячы на заядлую вайну кітайскай контр-рэвалюцыі і інтэрвэнцыю імпэрыялістаў.

Шалёныя надзеі справакаваць СССР на вайну

Аднак, японская інтэрвэнцыя таксама прабудзіла шалёныя надзеі, што япона-кітайская вайна быць можа перакінецца і на тэрыторыю СССР. У 1924 г. Савецкі Саюз, ануляваў савецка-кітайскай згодай усе няроўныя дагаворы, што зьявілася першым празнаньнем незалежнасьці Кітая з боку буйной дзяржавы. Гэтага вы ніколі не даруеце СССР. Французкія капіталісты да гэтага часу яшчэ ня прызналі савецка-кітайскага дагавору адносна КУЧ і некалькі год таму назад высоўвалі праекты інтэрнацыяналізацыі КУЧ.

Далей тав. Дорыё цытуе артыкул «Рэвю Мілітэр Франсэз» за верасень і падкрэсьлівае, што гэта часопіс, якая выдаецца пры садзейнасьці французкага генштабу, настойвае на тым, што Францыя мае свае «правы» на КУЧ. Ці думаеце вы зноў узьняць пытаньне аб КУЧ, выкарыстаўшы цяперашнюю вайну ў Манчжурыі і ў часе вашых перагавораў з Японіяй ці не вялі вы з Японіяй аб гэтым гутаркі?

Далей тав. Дорыё напамінае аб савецка-кітайскім канфлікце 1929 г., калі кітайскія войскі разам з атрадамі белых эмігрантаў, па ўказаньні заціхаўленых капіталістаў, нападалі на савецкую тэрыторыю і кам. СССР. «Бійцы гэтыя напады зараз-жа адпоў свае войскі, не скарыстаўшы сваёй ваеннай перавагі, не патрабаваў пасьля перамогі нічога, апрача паважаньня савецка-кітайскіх дагавораў.

Тав. Дорыё канстатуе: «У цяперашнім канфлікце СССР зноў пацьвердзіў сваю палітыку міра. У адказ на правакацыі Японіі СССР цьвёрда заявіў, што не жадае ўмешвацца ў япона-кітайскі канфлікт і што палітыка акупацыі, якая праводзіцца Японіяй, пагражае міру».

Сацыял-фашысты падтрымліваюць акупантаў

На рэпліку сацыяліста Грумбаха тав. Дорыё адказвае: «Канстатуем, што ў даным канфлікце сацыялісты нападаюць на СССР, а не на Японію. У паяўпасьці кааліцыя ўсіх парляманцкіх партый, апрача камуністычнай. Гэта кааліцыя падтрымлівае японскі імпэрыялізм».

Далей тав. Дорыё заяўляе, што адпаўленьне міра на Далёкім Усходзе магчыма толькі пры ўмове бездакладнай эвакуацыі японскіх войск і апуляваньні японскіх «асобных праў» у Манчжурыі, для чаго неабходна скасаваньне «няроўных дагавораў».

Мы патрабуем, — заяўляе тав. Дорыё, — у першую чаргу, каб Францыя анулявала няроўныя дагаворы з Кітаем, вывяла свае войскі з Кітая. Мы патрабуем замены няроўных дагавораў роўнапраўнымі. Працінікі нашых патрабаваньняў спасылаюцца на «безпарадак» у Кітаі, аднак, гэты «безпарадак» просты розультат няроўных дагавораў, якія дазваляюць імпэрыялістам падтрымліваць паасобных кітайскіх генэралаў, што вядуць паміж сабой вайну за сфэры ўплыву. Калі-б ня было няроўных дагавораў, кітайскі народ даўно змог-бы пазбавіцца кітайскіх генэралаў і ўстанавіць парадак у сваёй краіне».

«Пралетарыят і народы ўсяго сьвету, — гаворыць у заключэньне тав. Дорыё, — якім абяцалі, што сусьветная вайна 1914 г. будзе апошняй, бачаць набліжэньне новай вайны, больш жахлівай чым мінулая. Праз галаву палатаў я зварачаюся да пралетарыяту і народаў усяго сьвету з заклікам, каб яны былі пільнымі і стварылі адзіны фронт барацьбы супроць імпэрыялістычных бандытаў для абароны прыгнечаных народаў і сацыялістычнай бацькаўшчыны — СССР». (ТАСС).

БІБЛІЯГРАФІЯ

Л. Гурэвіч „Да перавыбараў парторга наў", ДВБ (45 стар.)

Партыйна-масавы сэктар ДВБ выдаў брашуру да перавыбараў партыйных органаў. Ідэя выданьня такой брашуры вельмі пэтазгодна. Такая брашура павінна была-б дапамагчы ячэйкам зьвязаць, пераламіць агульныя партыйныя задачы прыстасоўна да данай арганізацыі. Такая брашура павінна была-б дапамагчы ячэйкам за сваімі мясцовымі справамі не праглядзець агульных партыйных задач, дапамагчы разгарнуць барацьбу за адзінства партыі, супроць апартунізму і прымірэнцтва ў тэорыі і на практыцы. Брашура павінна была-б дапамагчы ячэйкам ужыць у канкрэтных умовах заводу і чыгункі пасьць у оў тав. Сталіна, павінна была-б дапамагчы сельскім ячэйкам зразумець новыя ўмовы, у якіх мы працуем, у якіх працуюць калгасы, у якіх працякае загатоўчая кампанія і г. д.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што першая выданая да перавыбараў брашурка падалася. Аўтар не нездавальняюча справіўся з пастаўленай перад ім задачай. Станоўчым у брашуры зьяўляецца тое, што да яе даданы пастановы ЦК КП(б)Б аб перавыбарах партыйных органаў. Сама-ж брашурка напісана вельмі нядбайна, мае ў сабе рад недапушчальных недахопаў і фармулёвак, якія робяць немагчымым карыстаньне ёю.

1. Аб шасьці ўмовах тав. Сталіна. Тав. Гурэвіч успамінае аб іх пару раз на працягу брашуры. Але гэта толькі фразы. Ні разу не даецца разгорнутага тлумачэньня, якое значэньне мае іх рэалізацыя. Аўтар не паклапаніўся нават поўнасьцю пералічыць гэтыя ўмовы. Вось адзіны «разгорнуты» абзац аб шасьці ўмовах:

«Паяўпасьць прарываў (толькі пры паяўпасьці прарываў **М. Г.?**) патрабуе ад перавыбарчай кампаніі ўзмацненьня мабілізацыі мас па рэалізацыю **прамовы т. Сталіна.** Кожная вытворчая парт'ячэйка павінна праверыць, наколькі ажыцьцяўляецца арганізаваны набор рабочай сілы для фабрык і заводаў, наколькі шырока дастасоўваецца мэханізацыя вытворчасьці, наколькі ўкаранілася новая тарыфная сыстэма, як партыйныя арганізацыі вядуць змаганьне **супроць ураўніўкі** і наколькі яны ў цэнтры сваёй увагі паставілі **пытаньні рабочага снабжэньня.** Змаганьне за пасьлядоўнае ўвядзеньне сапраўднага гаспадарчага разрахунку—важнейшая арганічная частка правядзеньня перавыбарчай кампаніі».

Тав. Гурэвіч, як гэта відаць з тэксту, упусьціў дзве ўмовы тав. Сталіна. Ён упусьціў **чацьвертую ўмову** аб падрыхтоўцы новых спэцыялістаў. Ён забыў задачу, настаўленую тав. Сталіным:

«... абіцца таго, каб у рабочае клясы была свая ўласная вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя».

Тав. Гурэвіч не заўважыў і **пятай** ... тав. Сталіна. Ён не мабілізуе ... ўнай арганізацыі на яе выкананьне. Тав. Сталін у сваёй прамове гаварыў:

«Выходзіць, далей, што нельга па-старому валіць у адну кучу ўсіх спэцыялістаў і інжынэрна-тэхнічных сіл старой школы. Каб улічыць абстаноўку, якая зьмянілася, трэба зьмяніць нашу палітыку і праявіць максымум клопатаў у адносінах да тых спэцыялістаў і інжынэрна-тэхнічных сіл, якія напэўна наварочваюць у бок рабочае клясы».

Як гэта ня дзіўна, але тав. Гурэвіч «умудрыўся» змазаць, забыць аб палітыцы партыі ў адносінах да спэцыялістаў.

Хаця аб другіх умовах аўтар брашуркі і ўспамінае, але бязумоўна недаволі і нездавальняюча. Брашура не мабілізуе хоць колькі-небудзь у выстарчальнай меры на выкананьне якасных паказальнікаў пляну, а разам з тым іменна на тым, як выконваюцца якасныя паказальнікі пляну, мы павінны перш за ўсё меркаваць аб рабоце прадпрыемстваў і партыйных арганізацый. Брашура не мабілізуе таксама на рэалізацыю лёзунгу тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай.

2. Аб барацьбе за адзінства партыі супроць апартунізму. Гэтай тэме тав. Гурэвіч прысьвяціў тры старонкі. І вось, як гэта ня дзіўна, тав. Гурэвіч, выпускаючы брашурку для ячэек у сувязі з перавыбарамі партыйных органаў, забыўся аб неабходнасьці змагацца з **прымірэнцтвам** да ўхілаў ад лініі партыі. Ці ня ясна, што гнілыя лібэральныя адносіны да апартунізму і да прымірэнцтва да яго зусім непярпімы. Нельга змагацца з апартунізмам, не мабілізуючы мас на барацьбу таксама і супроць прымірэнцтва. Тав. Гурэвіч павінен зразумець, што нельга разьбіць да канца апартунізм, не вядучы рашучай і бязьлітаснай барацьбы са ўсякім праяўленьнем прымірэнцтва.

Змагаючыся супроць апартунізму т. Гурэвіч, дапусьціў і цэлы рад няправільных і палітычна шкодных фармулёвак. Вось два прыклады:

«Правы апартунізм у радзе месц **перарастае** (падкрэсьлена мною — **М. Г.**) у апартуністычную практыку і служыць імкненьням і тактыцы кулака ў яго змаганьні супроць калгасаў».

«Правыя апартуністы па сваёй прыродзе ні ў якім разе нездольны ўмела злучыць правядзеньне ўсіх важнейшых кампаній і мерапрыемстваў партыі».

У тав. Гурэвіча атрымліваецца, што правы апартунізм толькі **перарастае** ў апартуністычную практыку. Ці-ж ня ясна, што апартунізму няма чаго перарастаць, бо ніякай іншай практыкі ён нездолен ажыцьцяўляць. Другая памылковая фармулёўка бясспрэчна выцякае з першай. Хіба-ж апартуністы па сваёй прыродзе толькі **«нездольны ўмела злучыць»** пастаноў партыі, але яны адносяцца да іх варожа, змагаюцца супроць іх, працуюць іх **актыўна** сарваць.

3. Аб некаторых іншых памылках брашуры. Аўтар у сваім разьвіцьці аб загатоўках «умудраецца», напрыклад, ні слова не сказаць аб выкананьні цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі элемэнтамі, хаця гэты вучастак барацьбы за збожжа варты бясспрэчна вялікай увагі партыйных арганізацый. Тав. Гурэвіч палічыў, відавочна, не патрэбным хоць адным словам напомніць аб выяўленых у часе збожжазагатоўчай кампаніі буржуазных перараджэнцах. Ня дана ў брашуры нагул колькі-небудзь здавальняючая ацэнка стану загатовак.

Тав. Гурэвіч пазбыў магчымым нічога не сказаць аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з неабходнасьцю далейшага ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны і гэта, ня гледзячы на тое, што пастанова ЦК КП(б)Б прыкоўвае да гэтай справы ўвагу ўсёй партыі.

Мы ня маем магчымасьці пералічыць усіх іншых недахопаў брашуры. Але і сказанага даволі для таго, каб зрабіць вывад, што брашурай ні ў якім выпадку нельга карыстацца, як падмогай у часе перавыбарчай кампаніі.

М. Г.

За большую чоткасьць у прамысловасьці

МАСКВА, 29. Нам. старшыні ВСНГ СССР т. Пятакоў катэгарычна забараніў:

1. Галоўным кіраўніцтвам, галінавым сэктарам ВСНГ, усім гаспадарчым органам і прадпрыемствам, пад асабістую адказнасьць іх кіраўнікоў упосіць якія-б там ні было зьмены ў аплату працы, зьвязаныя з павялічэньнем устаноўленых фондаў зарплаты і сабекошту вырабаў.

2. Усім прадпрыемствам бязадкладна прывесьці колькасьць рабочых у адпаведнасьць з сапраўднай патрэбнасьцю пры фактычным выкананьні вытворчай праграмы. Забараніць прадпрыемствам пад адказнасьць дырэктароў праводзіць набор новых рабочых без дазволу кіраўніка аб'яднаньня.

3. Усім гасаб'яднаньням устанавіць строгі сыстэматычны кантроль за выкананьнем прадпрыемствамі дырэктыў па наборы новых рабочых і выплатканьні фондаў зарплаты ў адпаведнасьці з выкананьнем вытворчай праграмы.

4. Павялічэньне фондаў зарплаты можа быць дапушчана толькі з дазволу. На вінаватых у парушэньні дырэктыў па захаваньні ўстаноўленых фондаў зарплаты, аб'яднаньням прапанавана накладаць дысцыплінарныя спагнаньні, а ў паасобных выпадках прыцягваць да крымінальнай адказнасьці.

5 паяўных у прадпрыемстве сродкаў —гаворыцца ў загадзе, — у першую чаргу павінна быць забясьпечана выплата зарплаты. За невыкананьне гэтага асабістую адказнасьць нясуць дырэктары заводаў, начальнікі будоўляў і кіраўнікі аб'яднаньняў і трэстамі.

БССР занесена на чырвоную дошку

За пасьляховае забесьпячэньне Данбасу крапежным лесам

МАСКВА.

Літаб па правядзеньні штурмавога месячніка снабжэньня Данбасу крапежным лесам пастанавіў: у выніку работы на працягу дзьвюх дэкад штурму пакінуць пераходны чырвоны сьцяг за арганізацыямі Карэліі і рэдакцыяй «Цунайнен Кар'яла»; уручыць рагожны сьцяг арганізацыям Паўночна-Каўкаскага краю; занесьці на чырвоную дошку арганізацыі Маскоўскай і Заходняй абласьцей, Паўночнага краю і БССР; на чорную дошку — арганізацыі Цэнтральнай Чорназемнай вобласьці, Украіны, Уралу і «Южуралмес».

Перавод устаноў на 6-ці дзённку

Народны камісарыят працы БССР устанавіў наступны парадак пераходу на 6-дзённы перапынны тыдзень.

Усе наркаматы, банкаўска-крэдытныя ўстановы, квапэрацыйныя цэнтры, аддзяленьні, канторы (філіялы) трэстаў і аб'яднаньняў саюзнага значэньня, якія могуць быць пераведзены на 6-дзённы перапынны тыдзень, павінны падаць у Наркампрацы БССР адпаведныя заявы аб пераводзе свайго апарату. У іх павінна быць паказана колькасьць служачых да пераходу на бесьперапынны тыдзень, пік работнікаў пасьля пераходу на бесьперапынку і меркаваньні аб колькасьці, неабходнай у сувязі з пераходам на 6-дзённы перапынны тыдзень. У заяўках павінна быць адзначана, якую эканомію дасьць пераход у выніку скарачэньня штатаў і ў сувязі з гэтым зьніжэньне адміністрацыйных выдаткаў.

Усе цэнтральныя ўстановы павінны адначасова прыслаць матар'ялы аб парадку пераходу падпарадкаваных ім тыдзень, пік работнікаў пасьля пераходу на бесьперапынку і меркаваньні аб колькасьці, неабходнай у сувязі з пераходам на 6-дзённы перапынны тыдзень. У заяўках павінна быць адзначана, якую эканомію дасьць пераход у выніку скарачэньня штатаў і ў сувязі з гэтым зьніжэньне адміністрацыйных выдаткаў.

Усе цэнтральныя ўстановы павінны адначасова прыслаць матар'ялы аб парадку пераходу падпарадкаваных ім ведамстваў.

Шпалерная фабрыка выканала пяцігодку за 3 гады

МЕНСК. (БЕЛТА). 27 лістапада прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў даклад дырэктара менскай шпалернай фабрыкі імя Варо́ўскага аб выкананьні пяцігадовага пляну.

Дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву, шырока разгорнутаму сапсаборніцтву і ўдарніцтву, правядзеньню раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, фабрыка выканала свой пяцігадовы плян за тры гады. Вынікі зьніжэньня сабекошту значна перавысілі плянавыя меркаваньні—сабекошт зьніжан на 29,2 проц. супроць 12,3 проц. паводле пяцігадовага пляну.

Прэзыдыум ЦСПСБ узьняў хадайніцтва перад ЦВК і СНК БССР аб узнагароджэ шпалернай фабрыкі ганаровай граматай імя ЦВК.

На паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых фабрыкі і прэміяваньне лепшых ударнікаў асигнавана 25.000 рублёў.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— **Дом Камасьветы.** 30-XI ад 7—9 гадз. Індывідуальная кансультацыя па гісторыі УсеКП(б) і па матэматыцы.

— **30-га лістапада, у 7 гадзін вечары,** у памяшканьні гаркому КП(б)Б, (3-ці паверх, заля пасяджэньня) Мен. гарКК РСІ, сумесна з ЦП саюзу дзяржустаноў і рэдакцыяй газэты «Рабочий» склікаюць нараду ўсіх сапсумясьніцеляў, выдучаных у Дзяржустановы.

На нараду павінны зьявіцца брыгадзіры, якія былі выдучаны па абсьледаваньні, сакратары парткалектываў і ФЗМК прадпрыемстваў і падпэфных устаноў. Яўка абавязкова.

— **ПК ЦКИ КП(б)Б** просіць зьявіцца ў ПК тав. Уськова Міколу Васільлева (інспэктара райснабу б. Ветрынскага раёну) або паведаміць свой адрас (ці месца працы).

Просьба да ўсіх арганізацый, якія ведаюць месцанаходжаньне т. Уськова, паведаміць у ПК ЦКК.

— **30 лістапада, у 5 гадзін вечара, у памяшк. Камвузу (пакой 25) адбудзецца ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ Т-ВА ГІСТОРЫКАЎ-МАРКСЫСТАЎ.**

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Даклад тав. СЭРБЭНТА — Ліст тав. Сталіна і нашы задачы на гістарычным фронце.

2) Даклад тав. ЗАСЬЦЕНКЕРА — Аб выніках заходняй дыскусіі.

КІНО „КУЛЬТУРА"

Да ўсіх заўкомаў, фабкомаў, мясцкомаў, прафкомаў і паасобных членаў прафсаюзаў.

ад аўторка 1 сьнежня

ставіць новы выдатны мастацкі савецкі фільм вытворчасьці АРМЕНКІНО

„КІКОС" кіно-аповесьць у 6 частках

з эпохі паваканьня Дашынкаўскага ўраду ў 1919 г. у Арменіі.

Частка 1-ая—сьцерць бежанцаў
2-ая—іх канаваньне
3-ая—карныя атрады
4-ая—выбары ў парлямант Дашынкаўскага ўраду
Частка 5-ая—мабілізаныя ў Дашынкоўскае войска
6-ая—паўстаньне

СЦЭНАРЫ Захуд.-зран і Дарніціі.
РЭЖЫСЭР П. ЗАХУДАРАН.
АПЭРАТАР Станке.

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

МЭХАНІЧНЫЯ СПРОБЫ МЭТАЛЯУ палітасьветфільм у 2 частках

Пачатак сэансаў у 7. 8-40 і 10-20)—(Каса адкрыта з 5 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"

Сёньня і штодзённа | частацкі банёк

ВЫТВОРЧАСЬЦІ ДЗЯРЖКІНПРАМГРУЗІІ
У 2-х сэрыях 14 частках

ДЖАНКІ

1-я сэрыя ў 7 частках.

У галоўных ролях: Тамара Бопіводзе, Ніна Назарэшвілі, Н. Іллазашвілі і Н. Эрыставі.

Пачатак дзённых сэансаў у 2 г. і 3-30, вечарніх—у 6, 7-30, 9, 10-30.

КАСА адкрыта з 12 гадзін дня.

Чырв. Зорка Пач. 6, 7-30, 9, 10-30 — Гарольд Лёйд у фільме Баязьліваець да жанчын. Камэдыя ў 8 частках.

„КУЛЬТУРА" Пач: 7, 8-40, 10-20 — СВОЙ ХЛОПЕЦ кіно-аповесьць у 6 частках. ШАХМАТНАЯ ГАРАЧКА—камэдыя. Кіно-хроніка Беларэнкіно № 21.

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня — Шчасьлівыя кольцы арыгінальная камэдыя Саюзкіно. Кіно-НАРЫС № 50 выт. Саюзкіно.

„Новы Піянэр" (бурмін кіно „Культура") — Два фільмы ў адзін сэанс. 1) Сам сабе Робінзон. 2) Жыцьцё мора. Пач. 1 г., 2-10. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" К все адкр. з 5 г. — НІНІШ у 8 част. У галоўн. ролі ОСІ АСВАЛЬД. Пачатак сэансаў: 7, 9 і 10 45 к.

Дом Працасьветы (Камуністычная, 19). 30 лістапада, у 7 гадз. вечі. Выстаўком 4-й усебеларускай мастацкай выстаўкі АРГАНІЗУЕ ў сувязі з надыходзячай партыйнай нарадай па пытаньнях мастацтва ДЫСКУСІЙНЫ ВЕЧАР на тэму: Становішча і далейшыя задачы „130"—мастацтва БССР. Запрашаюцца прадстаўнікі партыйных і грамадзкіх арганізацый, рабочыя, мастакі, пісьменнікі, асьветнікі, навуковыя працаўнікі і інш.

Выстаўком

Пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР АДБУДЗЕЦЦА 30-га лістапада, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК МОПР'у БССР.

ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклад Калінкавіцкай чыгуначнай арганізацыі МОПР'у.
2. Даклад Дашынкавіцкай сельскай ячэйкі МОПР'у і суддакład Мазырскага РК МОПР'у аб рабоце на вёсцы
3. Аб чэрговым пленуме ЦК МОПР'у БССР.
4. Аб падпісной кампаніі на пэрыядычныя выданьні МОПР'у.
5. Аб фінляне пасьля заціскарджэньня ЦК МОПР'у СССР.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК і прэзыдыуму—абавязкова.

Разглядаецца актыў.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР—ЦУДЗІН

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян і устаноў, што з 1-XII-31 г.

Пяцеўскае малочнае таварыства Сапжахвал. с.-с.

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Асобы, якія маюць прэтэнзіі да вышэйпамянёнай установы, прычны прад'явіць ... на працягу 2-х месяцаў тэрміну. Пасьля гэтага тэрміну ніякіх заяў і прэтэнзій прымацца на будзе.

Старшыня ліквідкому Лапка.

ГЭТЫМІ дніямі выходзіць з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступае ў продаж

№ 11 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" № 11

Орган ЦК КП(б)Б.

ЗЬМЕСТ:

І. СТАЛІН — Да некаторых пытаньняў гісторыі бальшавізму (ліст у рэдакцыю часопісі „ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ").

ПЕРАДАВАЯ—XIV год Кастрычніка.

К. ГЕЙ — Да ітогаў лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

ШАРАНГОВІЧ.—Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацненьне колгасаў—цэнтральная задача.

ЭЙДЭЛЬМАН.—Да перавыбораў парторганаў.

М. ЮГАЎ—Партыя і падрыхтоўка Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі.

ВЫДРА. —За партыйнае змаганьне з шавінізмам.

РЫЎЛІН, ПОТАШ.— Аб двух памылковых і адным блытаным артыкуле.

Бібліяграфія.

ВЕРБА. — Аб адной нацыянал-апартуністычнай вылазцы.

Матар'ялы і дакументы.

Рэзалюцыі лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

І сьнежня 1931 г., у 7 г. вечі. у клюбе сяргандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай вул.)

СКЛІКАЕЦЦА

гарадзкая канфэрэнцыя камісій садзейнасьці

дзяржкрэдыту і ашчадкасе разам з грамадзкімі інструктарамі, членамі ФЗМК, а таксама працаўнікамі фін.-крэдытнага апарату гор. Менску.

Парадак дня: ход масівнага выканьня сродкаў у 4-м квартале 3-га рашэньня з году пяцігодкі.

Яўка паўнамоцных таварышоў абавязкова.

Менгарвон КП(б)Б,
Менгарадрафсавет,
Менгарвыканкам.

Ц. П. саюзу Белпрацасьветы і Ц. Б. Секцыі навуковых працаўнікоў на зьлёце ударнікаў і прафактыву, які адбудзецца 30-га лістапада г. г. у 7 гадзін вечара, у Доме Асьветы ставяць

ІНСТРУКЦЫЙНЫ ДАКЛАД

Старшыні Дзяржаўнага Вучонага Савету—т. В